ВОДНАЯ ПРАЦЭДУРА

БАЛЫ ДЛЯ КІРОЎЦАЎ

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

31 ЖНІЎНЯ 2018 г.
ПЯТНІЦА
№ 167 (28783)

9-24 стар.
МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
+TV ПРАГРАМА

ПАД ПУНСОВЫМІ ВЕТРАЗЯМІ

Кветкаводы ЖКГ Чачэрска Жанна БОРТНІКАВА і Лідзія ГАТОЎЧЫКАВА з вясны да восені клапоцяцца аб прыгажосці свайго роднага горада, з любоўю і настроем наводзяць парадак на вуліцах, азеляняюць іх, падстрыгаюць расліны. У невялікім горадзе пятнаццаць клумбаў, помнікаў і кампазіцый з кветкамі, і да кожнай з іх прыкладалі свае рукі гэтыя працавітыя жанчыны. І гараджане, і госці горада любуюцца на гэтыя «зялёныя творы», робяць сэлфі на іх фоне.

— Нам хочацца, каб Чачэрск быў не толькі чысты, прыгожы, але і адметны, набыў свой непаўторны твар, — кажа Жанна Бортнікава, і калега з ёй цалкам згодная.

Чачэрскую «брыганціну» пад пунсовымі ветразямі Жанна і Лідзія любяць асабліва, бо незвычайная клумба знаходзіцца каля аўтастанцыі — яна як талісман, як абярэг, «сустракае і праводзіць» падарожнікаў...

Анатоль КЛЯШЧУК,
фота аўтара.

■ Тэрмінова ў нумар

ЗАРПЛАТЫ МЕДЫКАЎ І ПЕДАГОГАЎ ПАДВЫСЯЦЬ З 1 ВЕРАСНЯ

У Беларусі павышаюцца тарыфныя стаўкі педагогам і работнікам сістэмы аховы здароўя, а таксама тарыфная стаўка першага разраду ўсім бюджэтнікам. Адпаведны праект пастановы Савета Міністраў падрыхтаваны па даручэнні кіраўніка дзяржавы і адобраны ім, паведамілі БЕЛТА ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны.

Прадугледжана павышэнне з 1 верасня заработнай платы асобным катэгорыям работнікаў аховы здароўя і адукацыі за кошт устанаўлення павышэння тарыфных ставак, акладаў і даплат. Так, педагагічным работнікам (уключаючы асоб з ліку прафесарска-выкладчыцкага складу) і памочнікам выхавальнікаў дзіцячых дашкольных устаноў прадугледжана павышэнне тарыфных ставак на 20 %. Даплаты ўрачоў і медыцынскіх сясцёр павысяць у памеры 20 % і 13 % адпаведна. Павышэнне акладаў правізараў, фармацэўтаў, фізікаў, хімікаў, біёлагаў складзе ад 40 да 100 ц%. Прадугледжваецца павышэнне з 1 кастрычніка 2018 года тарыфнай стаўкі першага разраду з 34 да 35,5 рублёў работнікам бюджэтнай сферы ў цэлым.

ЦЫТАТА ДНЯ

Вольга МАРШАЛКА, начальнік упраўлення кадравай палітыкі, установ адукацыі Міністэрства аховы здароўя:

«Ахова здароўя, медыцынскія тэхналогіі развіваюцца так імкліва, што дзеючы закон, які абнаўляўся ўсяго чатыры гады таму, ужо патрабуе карэкціроўкі. У 2019 годзе плануецца распрацаваць новую рэдакцыю закона аб ахове здароўя. Пры распрацоўцы будуць разглядацца ў тым ліку пытанні біяэтыкі, датычныя рэпрадуктыўных тэхналогій, транспланталогіі, кланавання і іншыя. Заканадаўча замацуюць і нормы медыцынскай этыкі і дэанталогіі. Праект адпаведнай пастановы Міністэрства аховы здароўя падрыхтаваны. Пастанова дазволіць унесці ў службовыя абавязкі медыцынскіх работнікаў увесь пералік па этычных момантах, чаго раней мы не маглі зрабіць. Гэта будзе прававы дакумент».

ISSN 1990 - 763X

Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ:

«Свет беларускай літаратуры сёння проста бязмежны»

Міністр інфармацыі — пра тыражы і асобнікі, класікаў і сучаснікаў і пра тое, якой бы кнігай пахваліўся Скарыну

Ужо заўтра ў Іванаве распачнуцца першыя мерапрыемствы юбілейнага, 25-га Дня беларускага пісьменства. Як заўсёды, свята для тых, хто піша, і для тых, хто любіць чытаць, збярэ гасцей з усёй краіны і з-за межаў Беларусі. Асноўным яго арганізатарам па традыцыі выступае Міністэрства інфармацыі. Таму цалкам лагічна перад Днём беларускага пісьменства пра ўласна пісьменства «і вакол яго» пагутарыць з міністрам інфармацыі Аляксандрам КАРЛЮКЕВІЧАМ.

— Аляксандр Мікалаевіч, летась Дзень беларускага пісьменства праходзіў пад эгідай 500-годдзя беларускага кнігадрукавання — тэма, якая да нашага пісьменства мае самае непасрэднае дачыненне, і прайшло свята з вялікім размахам, сапраўды маштабна. Сёлета тэма — малая радзіма — таксама маштабная, вымагае дэталёвай падрыхтоўкі, да таго ж сам Дзень пісьменства юбілейны, 25-ы. Як вы лічыце, сёлета ўдасца ўтрымаць тую планку, той узровень, узняты год назад?

— Чаму б і не? Людзі, якія працуюць над арганізацыяй святкавання, адказныя. У Іванаўскім раёне кіраўніком на працягу болей як дзесяці гадоў Юрый Бісун. Чалавек дасведчаны, граматны, цікаўны і да асветніцтва, культуры.

СТАР. 2

■ Спецыяльны рэпартаж

РЭЛЬЕФ ПЕРАМОЖЦАЎ

Як пад Навагрудкам рыхтуюць перспектыўных біятланістаў

Адным з самых папулярных відаў спорту ў Навагрудскім раёне з'яўляецца біятлон, ім займаецца каля 300 дзяцей у рэгіёне. Плумачэнне простае — у раёне ёсць унікальная спартыўная школа, якая ўжо доўгія гады рыхтуе высакакласных спартсменаў у гэтым відзе спорту. Яна размясцілася ў вёсцы Сялец.

Спартыўна-біятлонны комплекс знаходзіцца за адзін кіламетр ад самага «высокага» горада ў Беларусі. Тут выраслі такія вядомыя спартсмены, як удзельніца алімпійскіх гульняў Людміла Ананька, чэмпіёнкі свету па летнім біятлоне Таццяна Шынтар, Аліна Савосцік, Вікторыя Шымко. Усяго выхаванцамі ДЮСШ № 1, якая месціцца ў Сяльцы, на міжнародных спаборніцтвах, у тым ліку чэмпіянатах свету, Еўропы, Кубках свету, заваявана 54 медалі.

Сёлета біятлонная база са стажам абнавілася і набыла новы выгляд. Федэрацыяй біятлона было вырашана правесці ў Сяльцы I этап Кубка Беларускай федэрацыі біятлона па летнім біятлоне. Каб прыняць гэты турнір належным чынам, неабходна было палепшыць некаторыя складнікі аб'екта.

СТАР. 4

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

АДСЛУЖЫЎ ЯК НАЛЕЖЫЦЬ

РАБОТА АЛЯКСАНДРА СУРЫКАВА Ў БЕЛАРУСІ ЗАСТАНЕЦЦА Ў ГІСТОРЫІ ЗНАЧНАЙ ПАДЗЕЯЙ

Аб гэтым заявіў Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Расійскай Федэрацыі ў Рэспубліцы Беларусь Аляксандрам Сурыкавым, які завяршае дыпламатычную місію ў нашай краіне.

Беларускі лідар падзякаваў Сурыкаву за ўсё тое, што ён зрабіў для Беларусі і Расіі. На яго думку, работа дыпламата ў нашай краіне застанецца ў гісторыі значнай падзеяй. «І дай бог, каб тыя паслы, якія будуць тут працаваць, змаглі паўтарыць менавіта тое, што зрабіў пасол Сурыкаў, — пажадаў ён. — Калі будзе так, я буду толькі задаволены».

«Я выдатна разумею, што такое пасол і што ён усё роўна з'яўляецца чалавекам адносна несвабодным, ён адлюстроўвае пункт гледжання кіраўніцтва краіны, перш за ўсё — Прэзідэнта. Але тым не менш як рускі чалавек, як чалавек, які нямала пражыў у той адзінай краіне — мне гэта вельмі падабалася і я гэта вельмі цаню, — Аляксандр Аляксандравіч заўсёды бачыў Беларусь не як чужую, таму я і кажу: Беларусь — твая таксама, дакладна так, як і многіх беларусаў», — падкрэсліў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка дадаў, што ведае афіцыйны пункт гледжання пасла Расіі ў Беларусі і ведае яго ўнутраны стан, калі ён кажа пра рускіх, беларусаў. «Я думаю, нашы пазіцыі супадаюць. Мы людзі, якія паходзяць ад аднаго кораня. Мы — народы аднаго дрэва, расіяне і беларусы, нікуды ад гэтага не дзецца», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт звярнуў увагу, што ў дзвюх дзяржаў ёсць розныя інтарэсы, аднак беларускія ніколі не супярэчылі расійскім, а расійскія — беларускім. «Я нездарма гаварыў пра тое, што анёл-ахоўнік для Беларусі — Расія, дакладна так, як для Расіі — Беларусь, нягледзячы на розніцу ў велічыні. Гэта не мае ў дадзеным выпадку ніякага значэння», — сказаў беларускі лідар.

У сваю чаргу Аляксандр Сурыкаў падзякаваў Прэзідэнту за вельмі высокую ацэнку яго працы. «Я, калі лічыць заўтрашні дзень, прапрацаваў у Беларусі 12 з паловай гадоў, — адзначыў дыпламат. — Гэта роўна палова тэрміну дыпламатычных адносін паміж Расіяй і Беларуссю».

Яшчэ пасол падзякаваў кіраўніку дзяржавы за канцэптуальна правільную ацэнку ўзаемаадносін дзвюх дзяржаў. «Я вельмі ўдзячны за тое, што за гэты перыяд усё-такі дзякуючы вам, Уладзіміру Уладзіміравічу, нейкімі намаганнямі нашых пасольстваў удалося, нягледзячы на шурпатасці, зблізіць пазіцыі народаў Расіі і Беларусі, — адзначыў Аляксандр Сурыкаў. — Калі ў гэтым ёсць хоць невялікая мая заслуга, то я таксама гэтаму надзвычай рады».

Акрамя таго, Аляксандр Лукашэнка паведаміў, што размаўляў па тэлефоне з Прэзідэнтам Расіі. «Ён учора патэлефанаваў, у развіццё нашых дамоўленасцяў у Сочы. Мы вызначыліся, калі мы сустрэнемся ў шырокім складзе, кіраўніцтва ўрада і гэтак далей. І я яму сказаў, што мы сустракаемся з Аляксандрам Аляксандравічам Сурыкавым. І я выказаў пункт гледжання наконт яго работы, — падзяліўся беларускі лідар. — Ён кажа: я вельмі рады, што ты так высока цэніш працу нашага пасла».

Нагадаем, на мінулым тыдні Уладзімір Пуцін прызначыў новага Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Расіі ў Беларусі, спецпрадстаўніка Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі па развіцці гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва з Беларуссю — ім стаў Міхаіл Бабіч.

* * *

Пасля сустрэчы з Аляксандрам Лукашэнкам Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Расіі ў Беларусі Аляксандр Сурыкаў пагутарыў з журналістамі.

На пытанне аб тым, як ён ацэньвае сваю работу і з якім настроем вяртаецца дадому, дыпламат адказаў наступным чынам: «Ну з якім настроем вяртаюцца на радзіму, гэта значыць, дадому? Ну вядома, з добрым. З якім настроем пакідаюць месца доўгай работы, а працую я тут 12 з паловай гадоў? Вядома, з пачуццём суму аб тым, што цяпер буду пазбаўлены гэтага. Я лічу, што мы нармальна ўзаемадзейнічалі з беларускім грамадствам, з народам і кіраўніцтвам Беларусі».

Аляксандр Сурыкаў дадаў, што з-за ўзросту і стажу працы (каля 60 гадоў) ён нарэшце зможа заняцца ўнукамі і іншымі справамі.

Што датычыцца прызначэння новага расійскага пасла ў Беларусі, то дыпламат падкрэсліў: пераемнасць ва ўзаемаадносінах паміж дзвюма дзяржавамі захаваецца. «І паслы, напэўна, я так разумею, павінны гэта падтрымліваць. Самі падыходы да работы — унутрыапаратныя і гэтак далей, канкрэтныя і больш канкрэтныя — гэта справа кожнага кіраўніка, я не бяруся судзіць. Важна, каб быў вынік — гэта далейшае збліжэнне нашых брацкіх краін. Вось на што трэба працаваць», — сказаў ён.

На думку пасла, вынік — гэта не толькі эканамічная частка. Эканоміка — фундамент для выбудоўвання выніку, акрамя таго, ёсць каласальная колькасць работы — культурнай, спартыўнай і іншай, — якая на гэтым падмурку выбудоўваецца.

Выказаўся ён і з нагоды магчымых шкадаванняў аб нязробленым. «Вы ведаеце, у кожнага кіраўніка, у тым ліку і ў паслоў, калі яны заканчваюць сваю работу на гэтай пасадзе, заўсёды ёсць шкадаванне, што чагосьці не дарабіў. Але гэта зусім не значыць, што трэба плакаць ад гэтага. Не дарабіў — значыць, іншы даробіць, толькі і ўсяго», — адзначыў ён.

На пытанне аб тым, калі чакаецца прыезд новага пасла, Аляксандр Сурыкаў адказаў жартаўліва: «Вось гэта ў яго і спытаеце, калі ён прыедзе».

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.

«Свет беларускай літаратуры сёння проста бязмежны»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У яго хапае памагатых — у самых розных галінах. І раённы Савет дэпутатаў вылучыў да свята розныя ініцыятывы. Відаць па ўсім, што грамадскасць не засталася ўбаку ад падрыхтоўкі і правядзення Дня беларускага пісьменства. Усе мерапрыемствы, што ладзіліся, усе тэмы, якія былі агучаны ў плане падрыхтоўкі да ўрачыстасцяў, на кантролі ў Брэсцкім аблвыканкаме. За што можна толькі падзякаваць і старшыні Анатолю Васілевічу Лісу, і яго камандзе. Так што, я ўпэўнены, свята пройдзе на ўзроўні.

А самае галоўнае — яго добры след павінен застацца менавіта ў Іванаве, на Іванаўскай зямлі. І праз мерапрыемствы святочнай праграмы, і праз многія сустрэчы з гасцямі святочных дзён. Застанецца працаваць новая кнігарня «Белкнігі». Пэўны след — добраўпарадкаванне на розных аб'ектах горада. Для кніжніц раёна — падарункам застануцца перададзеныя ў фонды кнігі. Прычым адно выданне прысвечана менавіта Іванаўскаму раёну. У Выдавецкім доме «Звязда» пабачыла свет падрыхтаваная раённай газетай «Янаўскі край» на чале з рэдактарам Ігарам Гетманам кніга нарысаў, гутарак «Людзі Янаўскага краю». Застанецца ў горадзе і памятны знак у гонар Дня беларускага пісьменства, і сад Малітвы, пасаджаны ўдзельнікамі экспедыцыі «Дарога да святыняў».

— Да Дня пісьменства традыцыйна падводзяцца вынікі работы кнігавыдавецкай галіны. Асаблівая тэма — кнігі, выдадзеныя па-беларуску. Колькасць назваў, якія пабачылі свет у беларускіх выдавецтвах, не змяншаецца. А вось тыражы не вельмі вялікія. Які з гэтых параметраў у сённяшніх стасунках, на ваш погляд, важнейшы, па якім можна меркаваць пра сітуацыю ў выдавецкай справе і вакол літаратуры ўвогуле?

— Адносна тыражоў не магу пагадзіцца. Яны ў працэнтных суадносінах альбо растуць, альбо зніжаюцца праз некаторы час, напрыклад, на 0,1 працэнта. Іншая справа, што невысокія тыражы ў кніг паасобку. Але ў гэтым — прыкмета часу. Летась было выдадзена 9 590 кніг і брашур агульным накладам 23 мільёны 100 тысяч экзэмпляраў. Няцяжка палічыць, што сярэдні тыраж адной кнігі — прыкладна 2,4 тысячы экзэмпляраў. Так, вельмі шмат кніг выдаецца накладам у 100 экзэмпляраў і менш. Як правіла, гэта датычыцца мастацкай ці дакументальнай літаратуры, якую выдаюць аўтары за свае сродкі.

— Сёлета чарговы раз будзе ўручана Нацыянальная літаратурная прэмія. Кампетэнтнае журы ўжо вызначыла пераможцаў. Але ёсць яшчэ галоўны суддзя — чытач. Як зрабіць так, каб гэтыя самыя кнігі-пераможцы сталі вядомыя шырокай публіцы, каб трапілі да гэтага строгага суддзі ў рукі?

— Усё залежыць ад аўтара, ад зместу кнігі і крышачку ад выдавецтваў, якія, канешне ж, займаюцца прапагандай кнігі. Дзяржава ўкладвае сёння дастаткова сур'ёзныя сродкі ў кнігавыданне. І праз датацыю пэўных праектаў, і праз падтрымку Саюза пісьменнікаў як грамадскай арганізацыі. І таксама — вылучаючы сродкі для выдання літаратурна-мастацкіх перыядычных выданняў. Але, як і ў любым сектары жыцця, шмат залежыць ад ініцыятывы, ад прафесіяналізму. Безумоўна, найперш — ад прафесіяналізму кіраўнікоў айчынных выдавецтваў, ад таго, як выбудоўваюць перспектывы развіцця нацыянальнай літаратуры ў рэдакцыях часопісаў. Адказнасць на ўсіх удзельніках кніжных, літаратурна-мастацкіх працэсаў надзвычай вялікая.

— Традыцыйны круглы стол «Мастацкая літаратура як шлях адзін да аднаго», які пройдзе ў рамках Дня пісьменства і ў якім возьмуць удзел літаратары розных краін, сёлета ў многім будзе прысвечаны праблеме мастацкага перакладу. У Беларусі на сёння развіта перакладчыцкая школа? І наколькі актуальнае пытанне перакладу беларускіх аўтараў на мовы свету? Каму тут, на ваш погляд, варта аддаваць перавагу: класікам ці сучаснікам?

— Перавагу аддаваць патрэбна добрай, якаснай літаратуры. Класіка таму і лічыцца класікай, што вытрымала выпрабаванне часам, таму, што характарызуе гістарычныя, нацыянальныя асаблівасці таго ці іншага народа. І пераўвасабляючы творы класічнай літаратуры, нашы айчынныя пісьменнікі, перакладчыкі выконваюць місію ўзбагачэння нашай роднай літаратуры, нашай роднай мовы, нашай культуры. І разам з тым нельга не разглядаць сучасную літаратуру. Яна ў найлепшых сваіх творах — адлюстраванне сучасных працэсаў, сучасных здабыткаў, сучасных драм і трагедый, над якімі нельга не разважаць.

Прыемна, што расце, узвышаецца вялікі атрад перакладчыкаў з мовы арыгінала — і з англійскай, і з нямецкай, і з польскай, і са шведскай... І нават з кітайскай. На ніве пераўвасаблення кітайскай прозы і паэзіі ў нас працуюць маладыя перакладчыкі Дар'я Нечыпарук, Алена Раманоўская, Кацярына Гардзей і шмат хто яшчэ. Дзякуючы іх памкненням, дзякуючы руплівасці супрацоўнікаў літаратурна-мастацкіх выданняў і кніжных рэдактараў Аляксея Чароты, Юліі Алейчанкі, Святланы Воцінавай, Вольгі Аляксеевай, Кацярыны Захарэвіч у нас выйшлі адмысловыя «кітайскія нумары» некаторых часопісаў — «Маладосць», «Нёман», «Бярозка». Дзякуючы ў значнай ступені ім робіцца і серыя кніг «Светлыя знакі. Паэты Кітая» — спярша яна выходзіла ў Выдавецкім доме «Звязда», цяпер — у «Мастацкай літаратуры». Выйшлі дзве аўтарскія анталогіі перакладаў кітайскай паэзіі на беларускую мову. Перакладчык — лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, лаўрэат Спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Мікола Мятліцкі. У кожнай з анталогій прадстаўлены 100 паэтаў Кітая. Зараз Мікалай Міхайлавіч падрыхтаваў вялікі зборнік паэзіі Ай Ціна.

А колькі зроблена па прадстаўленні беларускай літаратуры ў свеце. У апошнія гады над гэтым якраз і працавалі нашы госці — Юрый Шчарбакоў з Астрахані, Рэнат Харыс і Роберт Мінулін з Татарстана, Валеры Тургай з Чувашыі, Марат Гаджыеў з Дагестана, Зульфія Хананава з Башкартастана, Святлана Ананьева з Казахстана, Чынгіз Алі аглу, Камран Назірлі з Азербайджана, Ато Хамдам з Таджыкістана... А ў Чачэнскай Рэспубліцы склаўся асяродак сапраўдных сяброў беларускай літаратуры — Лула Куна, Руслан Кадзіеў, Адам Ахматукаеў, Пецімат Петрымава.

— Беларусы першыя з усходніх славян атрымалі друкаваную кнігу. Нагода для гонару, для асэнсавання сябе адукаваным народам, які заўсёды цаніў асвету. Але і вялікая адказнасць і перад сабой, і перад сусветнай супольнасцю, і перад будучымі пакаленнямі. Як Вы думаеце, у Скарыны і яго паслядоўнікаў была б нагода ганарыцца нашчадкамі тых, для каго ён друкаваў кнігі? І якую сучасную кнігу (або кнігі) міністр інфармацыі найперш прадэманстраваў бы першадрукару, каб паказаць яму, што яго справа ў надзейных руках?

— Перачытваю зараз раман Уладзіміра Караткевіча «Хрыстос прызямліўся ў Гародні». У сучасным выданні выдавецтва «Беларусь». Гартаю гэту ўнікальную, напоўненую гумарам і філасофскімі развагамі кнігу ў афармленні Міхася Басалыгі, і атрымліваю незвычайную асалоду. Як быццам у адначассе чытаю Гашака, Булгакава, Ільфа і Пятрова і нашых Мрыя і Максіма Гарэцкага. Столькі ў Караткевіча сэнсаў, столькі розных настрояў жыцця, што яшчэ раз пераконваешся, што класіка неўміручая. А ўсё таму, што гэта арыгінальны мастак, чалавек арыгінальнага таленту, і, канешне ж, любыя параўнанні хісткія і тым больш недакладныя. Упэўнены: Скарыну раман прыйшоўся б даспадобы, а афармленню выдання ён, несумненна, пазайздросціў бы.

З твораў сучаснікаў заўсёды чытаю паэзію і прозу Алеся Бадака, Людмілы Рублеўскай, Раісы Баравіковай, Міколы Мятліцкага, Казіміра Камейшы, Марыі Кобец, прозу Алега Ждана, Уладзіміра Саламахі, Алены Паповай, Алены Брава, гістарычную эсэістыку Івана Саверчанкі. Шмат цікавага ў дзіцячай літаратуры. Магчыма, далёка не ўсё я чытаю, але з цікавасцю адкрываю для сябе новыя кнігі Алены Масла, Галіны Пшонік, Анатоля Зэкава з яго паэтычнымі прыдумкамі, Міколы Чарняўскага, Анатоля Бутэвіча, Уладзіміра Ліпскага. Не абмінаю краязнаўчых публікацый Алеся Марціновіча, Анатоля Бензерука, Аляксандра Валковіча. І, канешне ж, вельмі ўважлівы да таго, што пішуць літаратуразнаўцы, літаратурныя крытыкі. Уражаны нядаўняй глыбокай кнігай Уладзіміра Гніламёдава і Міколы Мікуліча. З цікавасцю чытаю артыкулы Івана Штэйнера, Ірыны Шаўляковай. А ўвогуле свет сучаснай беларускай літаратуры сёння проста бязмежны. Гэта і выдаўцоў настройвае на пэўны лад, пэўныя хуткасці. Мабыць, нейкія падказкі да новых адкрыццяў можна будзе кожнаму з нас разгледзець і на Дні беларускага пісьменства ў Іванаве.

Пытанні задавала Алена ЛЯЎКОВІЧ.

■ Навасселле

ПРЫГОЖА І ФУНКЦЫЯНАЛЬНА

У Брэсце ва ўрачыстай абстаноўцы адкрылі новы дзіцячы садок

Дашкольная ўстанова ўзведзена па вуліцы генерала Благавешчанскага ў густанаселеным новым мікрараёне Паўднёвы Захад-2. Адкрыццё садка на 350 месцаў стала сапраўдным святам для сем'яў, якія нядаўна ўехалі ў новае жыллё. Да гэтай пары ім даводзілася вазіць дзяцей у іншыя раёны, нават праз палову горада.

Сучасны трохпавярховы будынак узвялі працаўнікі «Будтрэста № 8». На будаўніцтва і аснашчэнне ўстановы дашкольнай адукацыі было накіравана 9,2 мільёна рублёў з абласнога бюджэту. Садок атрымаўся прыгожы, светлы, функцыянальны. У апошнім упэўніліся ўсе, хто прыйшоў на адкрыццё. Яслі-садок разлічаны на 19 груп выхаванцаў. У трох групах будуць выхоўвацца дзеці з парушэннямі маўлення, у адной — з парушэннямі апорна-рухальнага апарату. Гэта значыць, бацькам дзяцей з асаблівасцямі развіцця больш не трэба вазіць малых у спецыялізаваныя ўстановы, якія размешчаны ў іншых частках горада: для дашкольнікаў у новым садку створаны ўсе ўмовы, адных толькі кабінетаў для творчасці налічваецца каля двух дзясяткаў.

Павіншаваць бацькоў, педагогаў, выхаванцаў з навасельлем прыйшлі кіраўнікі горада і вобласці, дэпутаты парламента. Старшыня Брэсцкага аблвыканкама Анатоль ЛІС падарыў садку чатыры дзіцячыя электрамабілі. Губернатар падкрэсліў, што правілам руху і паводзінам на дарозе трэба навучацца з самага ранняга ўзросту. Яшчэ кіраўнік вобласці сказаў, звярнуўшыся да прысутных, што на наступны год зусім побач будзе здадзена ў строй новая школа. Такім чынам, у Паўднёва-Заходнім мікрараёне з'явіцца цэлы адукацыйны комплекс.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

■ Першы званок

Дрэс-код для супершколы

Цудоўны падарунак атрымалі жыхары мікрараёна Заходні горада Бабруйска. Першага верасня іх дзеці адправяцца ў новую камфартабельную школу, якая пабудавана з улікам усіх сучасных дасягненняў і тэхналогій. Фінансаванне вялося адначасова з трох бюджэтаў — рэспубліканскага, абласнога і гарадскога. У Беларусі падобных школ яшчэ тры — у Мінску, Магілёве і Крычаве. За парты сядзе 1100 вучняў. Рэкордная тут колькасць пятых класаў — іх ажно восем! Для вучобы і развіцця дзіцячых прыродных талентаў тут створаны ўсе ўмовы. Прасторныя класы абсталяваны зручнай мэбляй, электроннае «начынне» налічвае 31 інтэрактыўную дошку, 13 мульцібордаў, 7 тэлевізараў з дыяганаллю экрана ў 43 цалі, на стале ў кожнага настаўніка — камп'ютар, у вучняў — электронныя дзённікі і асабістыя карткі. Спасцігаць азы матэматыкі і азбукі першакласнікам дапаможа лега-клас. Для заняткаў спортам ёсць дзве спартзалы, скаладром, гімнастычная зала, дзве баскетбольныя пляцоўкі, тры валейбольныя, хутка адкрыецца басейн з 50-метровымі дарожкамі. Для дзяцей з мастацкімі схільнасцямі падрыхтавана зала харэаграфіі. Для вучняў з абмежаванымі магчымасцямі прадугледжаны ліфты і пандусы, адмысловым чынам абсталяваны прыбіральні.

Высокі імідж школы прадугледжвае і наяўнасць дрэс-кода — вучні адзенуцца ў адметную школьную форму. Усе касцюмы павінны быць цёмна-сіняга колеру, а ў якасці аксесуараў выкарыстоўвацца будуць аранжавы гальштук і шаўрон з эмблемай школы.

— Гэта вельмі запатрабаваны аб'ект для горада Бабруйска, — адзначыла **начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Магілёўскага аблвыканкама Кацярына МУЗЫЧЭНКА.** — Школа пабудавана з улікам усіх сучасных патрабаванняў, і дзецям будзе вельмі камфортна займацца ў ёй. Для таго каб вучэбны працэс вёўся тут на самым высокім узроўні, зроблена ўсё. Спадзяёмся, і вынікі будуць годныя.

Дарэчы, на ўсе віды рамонту школ Магілёўскай вобласці сёлета з бюджэту накіравана 16 мільёнаў рублёў, а таксама 857 тысяч рублёў пазабюджэтных сродкаў і 620 тысяч рублёў шэфскай і спонсарскай дапамогі. Для падвозу дзяцей у навучальныя ўстановы будзе набыты 21 школьны аўтобус.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

З ТЭНІСНЫМ КОРТАМ І БАСЕЙНАМ

У сталіцы адкрыецца новая школа

1 верасня ў сталічных школах пройдуць урачыстыя лінейкі, прысвечаныя Дню ведаў і пачатку навучальнага года.

У Мінску за парты сядуць 193,5 тысячы вучняў. Гэта амаль на тры тысячы больш, чым летась. Будуць адкрыты 858 першых класаў (іх колькасць павялічылася на 26), а таксама 397 дзясятых класаў. Упершыню званок празвініць для 23184 хлопчыкаў і дзяўчынак.

Усяго ў Мінску ў новым навучальным годзе будуць працаваць 249 устаноў агульнай сярэдняй і спецыяльнай адукацыі, у тым ліку 178 школ і 50 гімназій.

У жылым раёне Брылевічы вучняў прыме новая школа пад нумарам 204, разлічаная на 1020 месцаў. Яе фасад пафарбаваны яркімі колерамі — здалёк кідаецца ў вочы. На прылеглай тэрыторыі размешчаны пяць спартыўных пляцовак: па дзве баскетбольныя і валейбольныя, а таксама тэнісная. Маюцца і трэнажорныя міні-комплексы.

Акрамя гэтых пляцовак, унутры будынка ёсць дзве спартыўныя, трэнажорная і харэаграфічная залы. Акрамя таго школа атрымала і два басейны, з дзіцячай і дарослай чашамі. Жыхары раёна змогуць набыць абанемент і ў пазавучэбны час плаваць у сваё задавальненне. А для таго каб усюды выконваўся парадак, унутры школы і на прылеглай тэрыторыі ўстаноўлена 26 камер відэаназірання.

Сяргей КУЛАКОЎ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Фермерам ЕС пагражае хваля банкруцтваў

Еўрапейскім аграрыям пагражае хваля банкруцтваў з-за летняй засухі, як чакаецца, асабліва пацерпяць фермеры бедных краін. Брусель экстранна рыхтуецца прыняць новыя меры дапамогі сельгасвытворцам, аднак гэтая падтрымка не мае на ўвазе выдзялення дадатковых сродкаў. Адпаведныя меры абмяжуюцца льготамі па частцы вытворчасці кармоў для жывёлы, паведаміў камісар ЕС па справах сельскай гаспадаркі Філ Хоган. Вырашэнне пытанняў фінансавай дапамогі ЕС пакідае за нацыянальнымі ўрадамі. Раней Еўракамісія дазволіла нацыянальным урадам увесці для фермераў паслабленні і выплаціць ім звычайную фінансавую дапамогу фондаў ЕС. Але дадатковыя грошы ўрадам прыйдзецца адшукваць самім.

Бразілія абараняецца ад мігрантаў

Прэзідэнт Бразіліі Мішэль Тэмер накіроўвае войскі ў штат Рарайма, размешчаны ля мяжы з Венесуэлай, з-за наплыву мігрантаў з гэтай краіны. Гэта, паводле яго слоў, дапаможа ў забеспячэнні парадку. Таксама кіраўнік дзяржавы адзначыў, што думае над увядзеннем штодзённых абмежавальных квот на пропуск венесуэльскіх бежанцаў. Улады штата Рарайма паведамляюць аб перагружанасці прапускных пунктаў на мяжы з Венесуэлай. Па іх словах, штодня туды прыбываюць ад 700 да 800 чалавек. «Гэта ўжо не пытанне ўнутранай палітыкі нашай краіны, яно ўжо закранае і іншыя краіны і пагражае гармоніі ўсяго нашага кантынента», — заявіў прэзідэнт Бразіліі. Па звестках ААН, з пачатку гуманітарнага і палітычнага крызісу краіну ўжо пакінула амаль 2,5 мільёна венесуэльцаў. Асноўны ўдар прымаюць на сябе суседнія краіны. Калумбія ўжо прыняла ў сябе больш за мільён бежанцаў, каля 400 тысяч — Перу, Бразілія — больш за 120 тысяч. ААН назвала сітуацыю з венесуэльскімі бежанцамі крытычнай і параўнала яе з аналагічнай праблемай з мігрантамі ў Еўропе.

Расія лідзіруе па аб'ёме інвестыцый у эканоміку Украіны

Расійская Федэрацыя знаходзіцца на першым месцы па аб'ёме інвестыцый у эканоміку Украіны ў першым паўгоддзі 2018 года, сведчаць даныя Дзяржаўнай службы статыстыкі Украіны (Дзяржстат). Агульны аб'ём прыцягнутых з-за мяжы інвестыцый у першай палове гэтага года — 1,25 мільярда долараў. Паводле звестак украінскага Дзяржстата, Расія ўклала $436 млн (34,6 працэнта ад агульнага памеру інвестыцый). На другім месцы па аб'ёме інвестыцый знаходзіцца Кіпр з $219 млн (17,4 працэнта). Тройку лідараў замыкаюць Нідэрланды — $207,7 млн (16,5 працэнта). Затым ідуць Аўстрыя — $58,7 млн, Польшча — $54,1 млн, Францыя — $46,9 млн, а таксама Вялікабрытанія — $43,4 млн. Дарэчы, па стане на 1 ліпеня мінулага года па аб'ёме інвестыцый ва ўкраінскую эканоміку Расія займала трэцяе месца.

■ Запрашальнік

ЮБІЛЕЙ З «ТРОІЦАЙ»

1 верасня ў Музеі народнай архітэктуры і побыту, што ў вёсцы Азярцо пад Мінскам, адбудзецца ўжо дзясяты па ліку фестываль «Камяніца».

На галоўнай музычнай сцэне выступяць гурт сярэднявечнай музыкі «Стары Ольса» і этна-трыа «Троіца», рок-музыкант Лявон Вольскі ў дуэце з джазменам, саксафаністам Паўлам Аракелянам і лірык Зміцер Вайцюшкевіч у суправаджэнні WZ-Orkiestra, каларытныя фолк-металісты з гурта Trollwald, а таксама госці з блізкага замежжа — фолк-калектыў Joryj Kloc з Украіны, стыль якога крытыкі вызначаюць як «казацкі брэйк-біт» ды «ўкраінскі абрадавы хіп-хоп» і «Тесто» з Расіі, які ператварае традыцыйныя напевы ў цалкам сабе сучасныя танцавальныя кампазіцыі з жывымі і электроннымі інструментамі.

Арганізатары фестывалю абяцаюць зрабіць яго найлепшым за дзесяць гадоў па ўсіх параметрах. «Мы пастараемся, каб усім гасцям, і дарослым, і дзецям, было камфортна. Запланавана некалькі музычных сцэн, мноства забаўляльных пляцовак і прыгожых выступленняў, кірмаш народных майстроў, вялікі фудкорт», — гаворыць каардынатар «Камяніцы-2018» Алег Пашак.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

ДЫЯЛОГ З УЛАДАЙ

Як паказвае вопыт, суботнія тэлефонныя лініі дапамагаюць аператыўна вырашыць праблемныя сітуацыі, якія ўзнікаюць у людзей. Упершыню такі дыялог адбыўся больш за два гады таму. За гэты час значна павысілася эфектыўнасць работы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб.

Прамыя тэлефонныя лініі адбудуцца і ў гэтую суботу, 1 верасня, з 9.00 да 12.00 іх правядуць:

намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама Андрэй Анатолевіч КЛЕЦ. Тэл. 8-016 221 31 21;

намеснік старшыні ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Уладзімір Пятровіч ПЕНІН. Тэл. 8-021 222 22 22;

намеснік старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Уладзімір Уладзіміравіч ГАРБАЧОЎ. Тэл. 8-023 233 12 37;

намеснік старшыні ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Віктар Андрэевіч ЛІСКОВІЧ. Тэл. 8-015 273 56 44;

намеснік старшыні МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Руслан Віктаравіч ПАРХАМОВІЧ. Тэл. 8-022 250 18 69;

намеснік старшыні МІНСКАГА аблвыканкама Мікалай Міхайлавіч РАГАШЧУК. Тэл. 8-017 500 41 60;

намеснік старшыні МІНСКАГА гарвыканкама Ігар Віктаравіч ЮРКЕВІЧ. Тэл. 8-017 222 44 44.

■ Дзеля памяці...

ПАЙШОЎ З ЖЫЦЦЯ «ГАЛОЎНЫ ГОЛАС СССР» ІОСІФ КАБЗОН

Учора ў Маскве на 81-м годзе жыцця памёр сімвал эпохі — народны артыст СССР, папулярны спявак, дэпутат Дзярждумы РФ, вядомы таксама сваёй гуманітарнай і міратворчай дзейнасцю, Іосіф Кабзон. Доўгі час ён пераадольваў анкалагічную хваробу, перанёс некалькі аперацый і пры кожнай магчымасці вяртаўся да актыўнага жыцця, аднак, на жаль, хвароба перамагла.

Шырокая папулярнасць да яго прыйшла ў 1960-х — спачатку дзякуючы немудрагелістай і кранальнай песні «А ў нас у двары» А. Астроўскага і Л. Ашаніна, прэм'ера якой адбылася ў эфіры радыёпраграмы «Добрай раніцы!», а потым, у 1964-м, пасля перамогі на Усесаюзным конкурсе артыстаў эстрады. Пазней цягам трох дзясяткаў гадоў спявак штогод выходзіў у фінал тэлевізійнага фестывалю «Песня года». Сярод самых вядомых песень у выкананні Іосіфа Кабзона — «Дзень Перамогі», «Я люблю цябе, жыццё», «Імгненні» і «Дзесьці далёка» з кінафільма «Сямнаццаць імгненняў вясны», «Не расстануся з камсамолам», «Журавлі» і іншыя. Наогул жа за амаль 60-гадовую творчую кар'еру спявак выканаў каля трох тысяч песень і выступіў з гастролямі ў больш як 100 краінах свету. Акрамя таго, Кабзона прызналі самым тытулаваным артыстам Расійскай Федэрацыі, яго імя занесена ў «Кнігу рэкордаў Расіі».

У Данецку, блізу якога ў гарадку Часаў Яр нарадзіўся Іосіф Кабзон, пройдзе жалобны мітынг. Пахаваюць жа артыста 2 верасня на Вастракоўскіх могілках у Маскве — побач з магілай яго маці, як таго і хацеў артыст.

Калектыў Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокае спачуванне кансультанту галоўнага ўпраўлення экалагічнай палітыкі, міжнароднага супрацоўніцтва і навукі Сушко Святлане Валер'еўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.

УП «Белконфискат» объявляет о проведении электронных торгов 24.09.2018 г. по продаже имущества, зарегистрированного на Пантелеенко Л. К.

Легковой седан «Мазда» 323, 1995 г. в., бензин, начальной стоимостью 1 300 рублей. На сайте Belkonfiskat.by размещена информация о лоте, порядке проведения торгов и участия в них. Справки по тел.: 8 (017) 2269489, 8 (029) 6350326.

УНП 190431606

■ Надвор'е

Цёпла нам і... кукурузе камфортна

Летні характар надвор'я захаваецца і ў пачатку наступнага тыдня

Цалкам добрае надвор'е для аграрыяў чакаецца ў краіне ў пачатку верасня, перадаюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Гледзячы на свае карты, сіноптыкі абяцаюць нам, што верасень пачнецца з летняга надвор'я. У гэтыя выхадныя будзе адчувацца ўплыў цёплай няўстойлівай паветранай масы, якая паступае з тэрыторыі Украіны. Пры такой сінаптычнай сітуацыі прырода парадуе ўсіх нас працягам лета, будзе анамальна цёпла. Тэмпература паветра ўначы ў суботу і нядзелю складзе ад плюс 10 да плюс 16 градусаў, а ўдзень будзе ад плюс 22 па паўночным захадзе да 28 цяпла па паўднёвым усходзе краіны. Месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы, удзень магчымы навальніцы. Ноччу і раніцай у асобных раёнах будуць узнікаць туманы. Вецер прагназуецца няўстойлівы, ноччу слабы, днём умераны.

Калі з цяплом у нас больш чым добра, то з ападкамі недабор. Самае засушлівае надвор'е ў жніўні было на ўсходзе Магілёўскай вобласці, дзе за месяц без малога выпала ўсяго 15—20 % месячнай нормы ападкаў, — перадае Белгідрамет. А ў краіне праводзіцца ўборка кукурузы на сілас. «Для атрымання якасных кармоў уборку сіласных пасеваў мэтазгодна правесці да наступлення поўнай спеласці. У найбліжэйшы час умовы надвор'я ў асноўным будуць спрыяць паспяванню зерня кукурузы і правядзенню ўборкі», — адзначылі ў Белгідрамеце.

З-за павышанага тэмпературнага рэжыму і больш ранняй сяўбы тэмпы развіцця кукурузы апярэджваюць мінулагоднія. Па апошніх даных аграметэаралагічных назіранняў, на большасці плошчаў у паўднёвых абласцях і ў цэнтральных раёнах Беларусі ў кукурузы ідзе паспяванне — наступіла васковая спеласць зерня, месцамі адзначаная яго поўная спеласць.

Сяргей КУРКАЧ

■ Футбол

БАТЭ мяняе турнір

БАРЫСАЎСКІЯ ФУТБАЛІСТЫ НЕ ЗМАГЛІ ПРАБІЦЦА Ў ГРУПАВЫ ЭТАП ЛІГІ ЧЭМПІЁНАЎ

У дзвюх сустрэчах падапечныя Аляксея Багі саступілі галандскаму ПСВ. Нагадаем, у Барысаве матч скончыўся з вынікам 2:3, а ў гасцях прадстаўнікі беларускага клуба саступілі 0:3.

«Мы сталі ўдзельнікамі фантастычнай гульні. Трэба прызнаць: далей ідзе наймацнейшы. Варта аддаць належнае хлопцам Марка ван Бомеля, якія правялі вельмі якасны матч і заслужылі пуцёўку ў групавы раўнд Лігі чэмпіёнаў, — адзначыў **галоўны трэнер БАТЭ Аляксей БАГА.** — *Віншуем сапернікаў з гэтым і жадаем поспеху! Мы ж змагаліся да канца — мне за сваіх футбалістаў не сорамна»*, — дадаў настаўнік.

Барысаўчане працягнуць еўракубкавы сезон у групе Лігі Еўропы, жараб'ёўка, падчас якой нашы футбалісты даведаюцца пра сваіх сапернікаў, адбудзецца сёння. *«Хто б нам ні трапіў, хочам даўжэй затрымацца ў Лізе Еўропы. Хочам, каб у саперніках у нас аказаліся каманды з футбольных краін, спадзяёмся, гэтыя матчы стануць гістарычнай падзеяй. На жаль, мы мала перажываем такіх момантаў, напрыклад, як у матчах з ПСВ. Хочацца акунуцца ў атмасферу, сутыкнуцца з сур'ёзным узроўнем. У любым выпадку будзем ставіць задачу выйсці з групы»*, — адзначыў Аляксей Бага.

Адзначым, паядынак з галандскім ПСВ стаў юбілейным для Аляксандра Глеба — 700-м на вышэйшым узроўні. 37-гадовы хаўбек «жоўта-сініх» стаў толькі другім беларускім футбалістам, які дасягнуў такой вялікай мяжы. А першы, каму гэта ўдалося, быў абаронца Аляксандр Юрэвіч, які лепшы адрэзак сваёй кар'еры правёў таксама ў БАТЭ (2008—2013 гады).

Дарэчы, барысаўскі клуб у цяперашнім еўракубкавым сезоне ўжо гарантавана зарабіў 7,92 мільёна еўра. 5 — за ўдзел у раўндзе плэй-оф Лігі чэмпіёнаў, 2,92 — за выхад у групу Лігі Еўропы.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

РЭЛЬЕФ ПЕРАМОЖЦАЎ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Напрыклад, старое стрэльбішча базы раней было разлічана ўсяго на 16 установак, пасля невялікай рэканструкцыі іх стала 20. Акрамя таго, цалкам замянілі стралковае абсталяванне і ўстаноўкі для стральбы. На тэрыторыі базы з'явілася некалькі судзейскіх домікаў з сучаснай апаратурай «Сівідата», а пры неабходнасці памяшканні могуць выкарыстоўвацца, як дадатковыя раздзявальні для дзяцей. Прайшлі і іншыя работы па добраўпарадкаванні тэрыторыі базы, напрыклад, створаны трыбуны для гледачоў і стаянка для аўтатранспарту наведвальнікаў. Дарэчы, з падвозам дзяцей з горада для трэніровак на спартыўную базу праблем няма, для гэтага існуе спецыялізаваны транспарт.

«Таксама мы палепшылі харчаванне і ўмовы пражывання, на цяперашні момант гасцініца нашага спартыўна-біятлоннага цэнтра разлічана на 44 месцы, — расказвае **дырэктар Віктар ЛІТВІНСКІ.** — Было праведзена шмат земляных работ, напэўна, іх аб'ём тысячы машын пяску і зямлі, пашыраны трасы, куды паклалі новы асфальт».

Дарэчы, працягласць трасы ў Сяльцы сёння 1800 метраў, яе рэльеф выдатна падыходзіць не толькі для трэніровак дзяцей (для іх ён на некаторых участках нават складаны), але і для дарослых спартсменаў, таму што змяшчае дастаткова стромкія пад'ёмы. Віктар Літвінскі адзначае, што біятлонная база пад Навагрудкам належыць ДЮСШ № 1, але ўжо на працягу дзясятка гадоў карыстаецца попытам і ў зімовы, і ў летні перыяд таксама ў беларускіх параалімпійцаў і маладзёжных камандаў Гродзенскай вобласці.

Фота БелТА.

«Яшчэ ёсць моманты, якіх нам не хапае, напрыклад, хацелася б зрабіць 2-3 асфальтаваныя кругі і трасы працягласцю 1500, 2000, 3300 метраў. Праектныя работы мы ўжо вядзём. Таксама няма ў нас на сёння снежнай пушкі. У бясснежныя зімы гэта сур'ёзная праблема».

Ужо на працягу 20 гадоў у Сяльцы штогод праводзіцца першынство БФСТ «Дынама» па біятлоне, прысвечанае памяці супрацоўнікаў дзяржбяспекі, якія загінулі пры выкананні службовых абавязкаў. Паколькі ў Гродзенскай вобласці падобны комплекс з такімі ўмовамі толькі адзін, тут жа праходзяць усе летнія і зімовыя спаборніцтвы вобласці, у прыватнасці «Снежны снайпер». А турніры, накшталт Кубка федэрацыі, лішні раз прымушаюць звярнуць увагу на такія невялікія, але важныя спартыўныя аб'екты ў глыбінцы і палепшыць іх для трэніровак падрастаючага пакалення.

Кубак федэрацыі, які нядаўна прайшоў, праводзіцца па аналогіі з Кубкам свету. У турніры пад Навагрудкам прынялі ўдзел зборныя каманды ўсіх абласцей краіны і горада Мінска, члены эксперыментальнай групы Наваполацкага дзяржаўнага вучылішча алімпійскага рэзерву. Выступілі таксама юныя біятланісты з Японіі — каманда прыехала на спаборніцтвы ў нашу краіну па запрашэнні Беларускай федэрацыі біятлона. Акрамя спартсменаў сабраліся ў Сяльцы і вядомыя ў біятлонных колах кіраўнікі і былыя спартсмены, сярод іх старшыня Беларускай федэрацыі біятлона Андрыян Цыбульскі, галоўны трэнер зборнай Беларусі па біятлоне Юрый Альберс, экс-біятланісты Людміла Ананька, Дзмітрый Будзіловіч, Алена Зубрылава, Вольга Назарава, Аляксей Айдараў, Пётр Івашка.

«Мы нездарма праводзім спаборніцтвы тут, — расказвае **Юрый АЛЬБЕРС.** — У Сяльцы добрая база і школа, з Навагрудка ў нас з'яўляецца шмат таленавітай моладзі. Таму федэрацыя вырашыла, што гэтую біятлонную базу трэба падтрымаць, развіваць і ўдасканальваць. Мясцовыя ўлады і арганізатары многае зрабілі, каб на годным узроўні прыняць гэты турнір: пашыраны стадыён і стрэльбішчы, асучаснілі іх, выраўнавалі агнявы рубеж. Тут добры рэльеф трасы, сюды раней прыходзіць зіма, снег трымаецца даўжэй, чым у іншых рэгіёнах».

Наконт далейшай рэканструкцыі цэнтра Юрый Альберс адзначыў, што трэба падыходзіць да гэтага пытання з двух бакоў і вызначыцца, база павінна быць ідэальным месцам для трэніровак або спаборніцтваў высокага ўзроўню. «Краіна ў нас невялікая і для таго, каб праводзіць турніры міжнароднага ўзроўню дастаткова «Раўбіч», гэта комплекс, які ўжо вядомы ва ўсім свеце. Што датычыцца нармальнага трэніровачнага працэсу і спаборніцтваў абласнога ўзроўню, то адзін з прыкладаў — Навагрудак. База ў Сяльцы дазваляе правесці добрыя спаборніцтвы абласнога ўзроўню ў зімовы перыяд. Каб рабіць гэта і ў летні час, трэба дапрацаваць лыжароллерную трасу, павялічыць яе хоць бы да 3 кіламетраў. Калі падобныя комплексы мы створым ва ўсіх рэгіёнах краіны, можна быць спакойным за будучыню нашага біятлона», — рэзюмаваў Юрый Юр'евіч.

Спартыўны складнік у Сяльцы, вядома, у прыярытэце, але каб аб'ект не пуставаў у вольны ад збораў і спаборніцтваў час кіраўніцтва цэнтра запрашае да сябе айчынных і замежных турыстаў. Сёння гэта месца адпачынку, якое карыстаецца вялікай папулярнасцю не толькі ў новагрудчан. «З нова года вырашылі далучыцца да сучасных тэхналогій і зарэгістраваліся на Booking.com. Пачалі прыязджаць замежнікі, — адзначае Віктар Багуслававіч. — Улетку наогул здарыўся бум, у гэтым ліпені паток пастаяльцаў вырас у чатыры разы ў параўнанні з папярэднім месяцам, свабодных нумароў не знайсці. Навагрудак цікавы горад з турыстычнага пункту гледжання, ёсць што паглядзець, шмат гістарычнай памяці, таму прыязджаюць турысты, а на начлег спыняюцца ў нас, бо цэны вельмі прывабныя, мне здаецца, нават самыя нізкія ў Беларусі».

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.
Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.
г. Навагрудак.

ГОРКІ ПРЫСМАК... ХАЛВЫ

За «ўсю Адэсу» я, вядома ж, не скажу — толькі за сябе: ну не люблю я сучасную ўпакоўку прадуктаў! І нават ведаю, за што.

Па-першае, досыць часта яна, гэтая ўпакоўка, як мне здаецца, каштуе куды даражэй, чым само яе змесціва; па-другое, — часам патрабуецца сіла (і немалая!), каб дастаць з яе тое ж марозіва, а бывае — неабыякая лоўкасць рук, каб адкрыць пакет і пры гэтым не рассыпаць на падлогу крупы ці цукар...

Не «ўтаптаць» асобныя пакеты і ў вядро для смецця — яны то «растапырваюцца» ва ўсю шырыню-глыбіню, то імкнуцца вонкі.

А самае крыўднае, што абгортка, упакоўка досыць часта падманвае нас, прычым самым нахабным чынам: «купляешся» — выбіраеш яе, прыгожую, яркую і... траціш грошы на абы-што.

Некалі, у крамах майго дзяцінства, было зусім не гэтак.

...У тыя часы прафесія прадаўца лічылася вельмі прэстыжнай. Ва ўсякім разе, калі ў адной дзяўчынкі настаўніца спытала, кім яна хоча стаць, тая тут жа адказала: «Дамасканіхай!», дзе Дамасканава, калі не зразумелі, прозвішча прадавачкі.

Дык вось, яе вясковую краму зараз назвалі б нейкім міні-маркетам, бо там было ці не ўсё. У невялічкім па плошчы памяшканні прадаваліся і харчовыя тавары, і прамысловыя, і з дзясятак кніг...

Мне ж найбольш падабаўся куток, дзе ляжалі косы, сякеры, малаткі, стаялі чыгункі і патэльні, раскрытыя скрыні з цвікамі ды іншым скабяным таварам. А побач з ім...

Дакладней — амаль побач — ляжала... мара майго жыцця: вялікая «пліта» халвы. Не ведаю, дзе яе тады выраблялі, але помню, у што ўпакоўвалі: у шчыльную празрыстую паперу. Пад сонцам яна літаральна «ўядалася» ў прадукт, але горшым яго не рабіла, — хутчэй наадварот: трымала форму, дазваляла ацаніць знешні выгляд, а ўжо смак... Халва — злёгку «падплаўленая» сонцам, да таго ж сапраўдная, са сланечніку (не тое, што сённяшні «сушняк») — выглядала вельмі апетытна!

Ці бачылі гэта мухі? Ну вядома ж! Але прадавачка з імі змагалася: ва ўсякім разе летам у краме заўсёды віселі адмысловыя стужкі. Мухі ліплі да іх, гінулі, а тыя, што заставаліся...

Столькі халвы пры ўсім жаданні яны з'есці не маглі!

Я — мог бы, здаецца, вось толькі грашыма ў дзяцінстве мяне не песцілі (як, зрэшты, і зараз), таму прысмакі купляў хіба зрэдку і вельмі мала.

Але аднойчы...

Помню як зараз: прадавачка ўзважыла — мне! — ажно дзвесце грамаў халвы!

Я разлічыўся, заціснуў яе ў руцэ і, шчаслівы (мара збылася!), лётам панёсся дамоў.

На тое, каб аддыхацца, часу, вядома ж, не меў: сеў за стол, разгарнуў упакоўку, зубамі ўпіўся ў смакоцце і... скрывіўся, бо нож у краме (я потым датумкаў) быў, напэўна, адзін. І прадавачка ім рэзала ўсё: некаму, у прыватнасці... селядзец, а потым ужо мне халву, ад чаго і пах яе, і прысмак...

Ад крыўды, ад роспачы я тады ледзь не плакаў! Але ж і спыніцца не мог: умінаў за абедзве шчакі той ласунак — да апошняй крошкі.

Адкуль выснова: нават найлепшыя прадукты можна лёгка сапсаваць — неахайным продажам альбо ўпакоўкай.

Яўген Шастакоў,

г. Гомель.

КАЛІ ДЗЕЦІ БЫЛІ МАЛЫЯ

У маленстве ды ў маладосці мы, згадзіцеся, больш лёгкія на пад'ём: купляем білеты, некуды ходзім і ездзім, наведваем, праведваем, чуем, бачым... Потым жа, пасталеўшы, а то і пастарэўшы, з усіх месцаў адпачынку выбіраем... канапу: садзімся альбо лажымся там, уключаем тэлевізар і — як здаецца, далібог не ўставалі б (у прыватнасці для таго, каб пайсці ў тэатр, цырк альбо парк), калі б не дзеці!.. А між іншым, эмоцый ды ўспамінаў ад гэтага — на ўсё жыццё. Ну вось напрыклад.

Неяк са сваімі малымі я адправіўся ў парк Чалюскінцаў. Прагулачным крокам мы дайшлі да так званага чортава кола і дзеці, вядома ж, захацелі падняцца на ім над зямлёй — паглядзець на сталіцу зверху.

Толькі сабраліся, узялі білеты, — як да нас падыходзіць нейкая маладзіца з малым і напрамілы бог просіць: калі

ласка, маўляў, пракаціце майго сынка! Я страшэнна баюся вышыні... А вы ж (гэта мне) чалавек надзейны?

Адмаўляць — жанчыне, пры дзецях і пасля камплімента — неяк не выпадала. Мы ўзялі ў кабінку яе хлопчыка і тут жа пашкадавалі, бо маці яго не паспела сказаць (а хутчэй спецыяльна не захацела), што сынок у яе... халерык. Мы ледзь пачалі пад'ём, як ён ужо тройчы падскочыў, пакруціўся на адной назе, стаў раскачваць «люльку». А далей — болей, як той казаў — перавешвацца за «борт»...

Ні просьбаў маіх, ні пагроз гэта дзіця не чула. Сядзенні пад намі хадзілі хадуном.

Да сёння помню халодны струменьчык поту, які «працякаў» паміж маімі лапаткамі, і адно, але палкае сваё жаданне — хутчэй спусціцца ўніз (жывым і з жывымі дзецьмі), стаць на зямлю.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 2998. Нумар падпісаны ў 19.30 30 жніўня 2018 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

31 жніўня 2018 г. № 35 (468)

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

Фота БелТА.

Да 2020 года ў Беларусі плануецца пабудаваць 500 станцый абезжалезвання.

ШЛЯХ ДЛЯ ВАДЫ

Якія праблемы водазабеспячэння патрабуюць сёння ўвагі ўлады і грамадзян?

ПРАЦЯГ ТЭМЫ — на 4–16-й стар.

НАД ЧЫМ ПРАЦУЕМ

КОЛЬКІ БАЛАЎ У КІРОЎЦЫ?

Як абмяркоўваюць папраўкі ў закон аб дарожным руху

На днях у Палаце прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі адбылася рабочая нарада Пастаяннай камісіі па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі з прадстаўнікамі Міністэрства ўнутраных спраў і іншых ведамстваў па законапраекце «Аб змяненні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб дарожным руху», які выклікаў мноства спрэчак у грамадстве. У сустрэчы прыняў удзел і карэспандэнт «МС».

У пачатку — тэорыя

Каб зразумець, пра што ішла гаворка на нарадзе, коратка нагадаем сутнасць прапанаваных паправак. За парушэнні Правілаў дарожнага руху кіроўца атрымлівае пэўную рэгламентаваную колькасць балаў. Адзін бал — гэта парушэнні, штраф за якія не перавышае трох базавых велічынь, а таксама тыя, што былі выяўлены з дапамогай фотафіксацыі. Два балы — парушэнні са штрафам да пяці базавых, тры — да 10 базавых, чатыры — якія прадугледжваюць больш за 10 базавых або пазбаўленне правоў. Атрымліваеш 15 і больш балаў за год — пазбаўляешся права кіравання транспартным сродкам на паўгода.

Ёсць парушэнні, за якія штрафныя балы не налічваюцца. Сярод іх: парушэнне правілаў эксплуатацыі транспартнага сродку — у частцы нумарных знакаў, эксплуатацыя або допуск да ўдзелу ў дарожным руху транспартнага сродку без дагавора абавязковага страхавання грамадзянскай адказнасці ўладальнікаў транспартных сродкаў. Акрамя таго, гэта парушэнне правілаў прыпынку і стаянкі транспартнага сродку, а таксама іншых правілаў дарожнага руху.

Сярод іншых новаўвядзенняў — права здаваць экзамен у ДАІ на машыне з аўтаматычнай каробкай перадач пасля праходжання адпаведнай падрыхтоўкі. У гэтым выпадку правы будуць выдаваць з адпаведнай адзнакай.

Ініцыявана пытанне аб выдачы міжнародных пасведчанняў кіроўцы, таксама працуюць над аспектам допуску да кіравання мотаўсюдыходамі.

Адкрытасць і дысцыпліна

Перад пачаткам мерапрыемства з прэсай пагутарыў **старшыня Пастаяннай камісіі па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі Андрэй РЫБАК.** Ён адзначыў, што работа над законапраектам будзе весціся максімальна адкрыта для таго, каб улічыць усе меркаванні — і грамадзян, і дзяржаўных органаў. Паводле яго слоў, сітуацыя на дарогах ускладняецца з кожным днём. Пры гэтым значная частка правапарушэнняў, пра што паведамляюць грамадзяне, — гэта вымушаныя парушэнні з-за недастатковай арганізацыі дарожнага руху. «Наша камісія лічыць, што мы менавіта на гэтым аспекце павінны зрабіць асноўны ўпор», — падкрэсліў дэпутат.

стар. 3

СЁННЯ Ў НУМАРЫ

Рэгіянальнае супрацоўніцтва

Агульнаму беларуска-расійскаму бізнесу ствараюць умовы стар. 2

Чаму перакрылі вентыль?

Людзі абураюцца і просяць вярнуць ім ваду з калгаснай свідравіны стар. 4

Празрыстая — не значыць прыгодная

Нітраты становяцца галоўнай небяспекай калодзежаў стар. 13

Камунальныя тэлефонныя дыспетчарскія

Ствараюць на Віцебшчыне для аператыўнага рэагавання на скаргі стар. 13

Чысціня на вёсцы

Лельчыцкі райсавет ініцыяваў штотыднёвыя суботнікі стар. 16

КРАСНОАРМЕЙСКАЯ, 9

ШКОЛЬНО И МОДНО

Спикер Совета Республики Михаил Мясникович принял участие в первой общеобластной школьной ярмарке в Кобрине

В минувшие выходные на площадке возле торгового центра «Полесье» свои павильоны разместили более 40 предприятий Брестской области. Все необходимое к школьному сезону — одежду, обувь, канцелярские принадлежности — можно было приобрести со скидками.

www.sovrep.gov.by

«Школьные ярмарки проводятся практически в каждом районе. Производители, торговля предоставляют определенные скидки, чтобы продукция была еще более доступной. С другой стороны, это возможность провести праздничное мероприятие. В Кобрине организовано все очень интересно», — отметил Михаил Мясникович.

По словам председателя Совета Республики, торговле на селе в нашей стране уделяется внимание наравне с городами. Это стало возможным благодаря Указу № 345 «О развитии торговли, общественного питания и бытового обслуживания», который гарантирует выгодные условия для предпринимателей в небольших населенных пунктах.

ЗНАНИЯ ЗА ПЛЕЧАМИ

Вице-спикер верхней палаты парламента Марианна Щеткина в рамках акции «Соберем портфель вместе» посетила агрогородок Шершуны Минского района

Фото БелТА.

В Год малой родины особое внимание уделяется и помощь оказывается сельским школам. В одну из таких в поселке Шершуны подарки от Белорусского союза женщин передала председатель общественного объединения Марианна Щеткина.

«Помочь пойти в школу каждому ребенку в каждой семье — это наш долг. Буквально в пятницу в союз поступило несколько звонков от многодетных семей с просьбой помочь собрать детей в школу. Нам это очень приятно: акция, действительно, уже стала республиканской. Люди знают, куда обращаться. Помощь готовы оказать все, мы в том числе», — передает слова Марианны Щеткиной пресс-служба Совета Республики.

В дар от заместителя председателя Совета Республики воспитанники учебно-педагогического комплекса «Детский сад — средняя школа» получили канцелярские принадлежности, книги и ноутбук. В свою очередь ребята приготовили для гостей концертную программу и экскурсию.

«Этим школам нужно больше помогать, в том числе по текущему ремонту, потому что не все можно сделать руками педагогического коллектива и родителей. Ребята везде должны прийти в светлые классы, хорошую теплую обстановку, к профессионалам», — подчеркнула Марианна Щеткина.

Без внимания не останутся и социальные приюты. Для их воспитанников также подготовили подарки к Дню знаний.

Мария ДАДАЛКО.

ГОСТИ С СЕВЕРА

Делегация парламента Финляндии во главе с председателем группы дружбы с Беларусью, членом фракции Национальной коалиционной партии Вилле РЮДМАНОМ впервые приехала в нашу страну. Во время визита, который проходит с 29 августа по 1 сентября, финские представители провели ряд встреч с руководством МИД, Минприроды, ПВТ. Вчера делегация обсудила вопросы повестки дня с председателем Совета Республики Национального собрания Михаилом МЯСНИКОВИЧЕМ.

«Поскольку у нас межпарламентские контакты были не очень активными, нам надо сейчас добавлять в работе для того, чтобы уровень парламентского сотрудничества был не ниже, а даже, может, выше, чем коммерческие контакты, — отметил спикер верхней палаты белорусского парламента. — Безусловно, нам надо посмотреть и по договорно-правовой базе. Я полагаю, что она может быть более полной».

Также Михаил Мясникович отметил, что группы дружбы, созданные в парламентах, — это хороший инструмент для развития отношений. Темами для обсуждения стало также региональное и международное сотрудничество. «Если стимулировать отношения между регионами наших стран, мы можем иметь достаточно неплохие успехи», — считает председатель Совета Республики.

Вилле Рюдман отметил, что взаимоотношения между нашими странами строятся на хорошей прагматичной основе. Он напомнил, что наши министры иностранных дел встречались уже трижды. К слову, когда-то у Беларуси и этой северной страны была общая история. А в прошлом году Финляндия праздновала сотую годовщину независимости.

Что касается торговли, Вилле Рюдман отмечает, что особое развитие можно наблюдать во взаимоотношениях между малым и средним бизнесом. Кроме того, член финского парламента обратил внимание на успешную работу совместных экономических форумов — последний прошел в Финляндии 31 мая. Финский представитель надеется, что рост экономических показателей продолжится. Безусловно, интерес к расширению своего присутствия в Беларуси у финнов есть.

По последним данным, в январе — июне этого года товарооборот между двумя странами составил 65 миллионов долларов США (111,9 % к аналогичному периоду 2017-го). В прошлом году белорусский экспорт в Финляндию насчитывал 94 товарные позиции, в том числе изолированные провода и кабели, легковые автомобили, продольно распиленные лесоматериалы, передаточные механизмы и оборудование транспортных средств. В нашу страну от этого северного партнера завозили мелованные бумагу и картон, рыбу, оборудование для сельского хозяйства, садоводства, лесоводства, а также лекарственные средства.

Вилле Рюдман обратил внимание на то, что для финской стороны является важным обсуждение тем верховенства права и защиты прав человека. «Я надеюсь, что, учитывая все используемые нами инструменты, наши контакты будут только развиваться и улучшаться в будущем», — подчеркнул финский парламентарий.

Надежда АНИСОВИЧ.

ОБЩЕМУ БИЗНЕСУ СОЗДАЮТ УСЛОВИЯ

Белорусские парламентарии обсудили с руководством российского региона возможность создания совместных производств

Председатель Совета Республики Национального собрания Республики Беларусь Михаил МЯСНИКОВИЧ на встрече с губернатором Астраханской области Александром ЖИЛКИНЫМ подчеркнул, что региональные связи являются основой белорусско-российского партнерства. Особое внимание, по его мнению, следует уделить вопросам создания совместных предприятий и производств. «Товарное сотрудничество — это важно и нужно, но поскольку мы работаем в условиях открытых экономик, все-таки надо делать общий бизнес. А для этого должна быть солидная промкооперация, совместные компании и, безусловно, инвестиционные проекты», — цитирует Михаила Мясниковича пресс-служба Совета Республики.

Он пригласил губернатора Астраханской области принять участие в V Форуме регионов Беларуси и России, который пройдет в Могилеве 10—12 октября.

В свою очередь Александр Жилкин согласился, что производителям техники Беларуси и России необходимо кооперироваться, создавать проекты, которые будут конкурентоспособны на мировом рынке. В числе приоритетных направлений он назвал производство коммунальных машин, автобусов, электробусов. «Мы готовы идти на совместные предприятия там, где имеем уровень компетенции, полезный для белорусских партнеров, и готовы участвовать в таких проектах на территории Беларуси», — подчеркнул губернатор. Он также предложил обсудить перспективы продвижения белорусских товаров с учетом комфортных условий, которые создают прикаспийские государства.

Кроме того, Александр Жилкин уделил внимание вопросам партнерства с Беларусью в области здравоохранения. Губернатор отметил высокий профессионализм белорусских специалистов, в частности в области кардиологии. Астраханская область сотрудничает с Беларусью в сфере охраны здоровья с 2015 года, когда представители российского региона посетили ведущие белорусские медицинские организации и обсудили взаимодействие в организации медицинской помощи детскому и взрослому населению.

Управление пресс-службы и информации администрации губернатора Астраханской области сообщает о результатах совместной работы в этом направлении. В рамках договора между Астраханской областной детской клинической больницей имени Н. Н. Силищевой и Республиканским научно-практическим центром детской хирургии (Беларусь) российские врачи прошли стажировку по вопросам неонатальной хирургии, анестезиологии и реаниматологии по технологии единой операционной бригады. В Астрахани были внедрены и применены у 128 новорожденных белорусские реанимационные и хирургические методики, их эффективность составила более 95 %. В результате существенно снизилось число случаев осложнений в раннем послеоперационном периоде.

Сайт администрации Астраханской области сообщает, что по итогам 2017 года внешнеторговый оборот российского региона с Беларусью составил 14,6 миллиона долларов и увеличился по сравнению с 2016 годом почти на 20 %. Белорусское «Столичное телевиде-

❍ Комментарий в тему

Председатель Постоянной комиссии Совета Республики по международным делам и национальной безопасности Сергей РАХМАНОВ:

— Финляндия для нас очень важный партнер. Несмотря на то, что страна на первый взгляд небольшая, она является одним из мировых лидеров в области экономики, инноваций, современных технологий, системы государственного управления, науки, образования... Мы очень ценим тот факт, что к нам приехала делегация парламента Финляндии во главе с председателем парламентской группы дружбы. Мы воспользуемся этим моментом для того, чтобы детально обсудить все основные направления взаимодействия, которые интересуют Беларусь. В первую очередь, конечно, это экономика, технологии.

Финляндия одна из первых в мире создала максимально эффективную инновационную систему, которая включает в том числе очень глубокую аналитику на уровне центральной власти, регионов, муниципалитетов. Это позволило максимально использовать интеллектуальный потенциал страны и в короткое время создать высокоэффективную экономику, которая сейчас является одной из лидирующих в мире наряду с такими странами, как Япония, Южная Корея, Германия, Швеция, Швейцария...

Финская сторона заинтересована в сотрудничестве с Беларусью. Сейчас у нас работают порядка 25 финских фирм, но ожидается, что в ближайшее время их число возрастет. И это будет делаться по разным направлениям. В первую очередь мы хотели бы сделать акцент на те отрасли, которые обеспечивают среднесрочное и долгосрочное развитие. К их числу относятся микроэлектроника, робототехника, биотехнологии, аддитивные технологии, нефтехимия, современная деревообработка, система корпоративного управления. И, безусловно, здесь важнейшим фактором является усиление взаимодействия в образовании и науке. Финляндия давно уже построила сетевую систему, которая обеспечивает взаимодействие университетов между собой вместе с бизнесом и системой госуправления. И это выразилось в создании кластеров. Они дали точки роста для таких крупнейших корпораций, как Nokia. Естественно, что этот опыт очень позитивен. И мы постараемся взаимодействовать с Финляндией, в том числе создавая сетевые университетские структуры между нашими странами.

Сейчас наша задача в том, чтобы этот визит не стал просто эпизодом в наших отношениях, а послужил основой для дальнейшей системной работы. И поэтому мы, безусловно, будем договариваться о создании такого механизма, при котором продолжим взаимодействие на постоянной основе. И не только во время визитов делегаций, но и в ежедневной работе на уровне экспертов.

Финляндия одна из тех стран, которые ориентированы на достижение региональной и мировой стабильности, и точно так же ориентирована Беларусь. Мы фактически находимся между Западом и Востоком, и наши скоординированные усилия могут дать хороший эффект для снижения напряженности, которая в данный момент присутствует.

РЕГИОНАЛЬНОЕ СОТРУДНИЧЕСТВО

Встреча председателя Совета Республики Национального собрания Республики Беларусь Михаила МЯСНИКОВИЧА с губернатором Астраханской области Российской Федерации Александром ЖИЛКИНЫМ.

ние» привело цифры за первое полугодие этого года: взаимная торговля превысила отметку в 20 миллионов долларов.

Визит официальной делегации Астраханской области во главе с губернатором проходил с 27 по 29 августа. В состав делегации вошли главы профильных министерств, представители бизнес-структур, законодательных органов и руководство ведущих медицинских организаций Астраханской области.

В рамках визита был подписан меморандум о сотрудничестве между Советом Республики Национального собрания Республики Беларусь и Думой Астраханской области Российской Федерации. С белорусской стороны документ подписал председатель Совета Республики Национального собрания Республики Беларусь Михаил Мясникович, с российской — председатель Думы Астраханской области Игорь Мартынов.

В соответствии с меморандумом стороны намерены содействовать развитию взаимодействия Республики Беларусь и Астраханской области Российской Федерации, расширению форм разносторонних межрегиональных связей.

Предусматриваются проведение совместных мероприятий, направленных на укрепление двусторонних межпарламентских отношений, развитие сотрудничества в научной и инновационной деятельности, обмен визитами делегаций, активизация связей между постоянными комиссиями и комитетами.

В целях реализации подписанного меморандума стороны договорились создать соответствующие группы дружбы между Советом Республики Национального собрания Республики Беларусь и Думой Астраханской области Российской Федерации.

Ольга МЕДВЕДЕВА.

КОЛЬКІ БАЛАЎ У КІРОЎЦЫ?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й «МС».)

Ён дадаў, што важна прапрацаваць дакумент у комплексе, не акцэнтуючы ўвагу на асобных нормах. Дарэчы, у самой камісіі пакуль няма ўстойлівага адзінага меркавання з нагоды ўвядзення бальнай сістэмы.

Яшчэ ў Андрэя Рыбака пацікавіліся аб тэарэтычным падзеле выплаты тэхагляду і дарожнага падатку. Старшыня камісіі адзначыў, што прапановы па гэтым пытанні, якія распрацоўваліся разам з Саветам Міністраў, накіраваныя кіраўніку дзяржавы. Парадак зменіцца, калі будзе прынята нейкае рашэнне, дадаў ён.

Пасля да журналістаў падышоў **намеснік начальніка ўпраўлення Дзяржаўнай аўтамабільнай інспекцыі міліцыі грамадскай бяспекі МУС Аляксандр ЦАГЕЛЬНІК,** які стаў галоўным спікерам мерапрыемства і адказваў на большасць пытанняў.

Аляксандр Цагельнік падкрэсліў: бальная сістэма акажа станоўчы прафілактычны эфект на бяспеку дарожнага руху. Паводле яго слоў, гэта прымусіць задумацца кіроўцаў, якія сістэматычна дапускаюць парушэнні ПДР, што не прыводзяць да пазбаўлення правоў. Такім чынам, яны стануць больш дысцыплінаваныя.

Рукі ўверх!

Выступоўца прывёў нямала цікавых лічбаў. З 2005 да 2017 года колькасць загінулых у ДТЗ знізілася ў 2,8 раза. У 2017 годзе на адзін мільён жыхароў Беларусі прыйшлося 62 смяротныя траўмы ў ДТЗ. Такіх вынікаў удалося дасягнуць на фоне значнага павелічэння колькасці транспартных сродкаў — за 10 гадоў іх парк павялічыўся на траціну, з 3,3 да 4,3 мільёна. Тым не менш у апошнія гады зніжэнне паказчыкаў замарудзілася, больш за тое — у 2017-м зніжэння дасягнуць не ўдалося. Прычына? Цяперашнія падыходы дазваляюць толькі захаваць бягучы вынік, а трэба працягваць памяншэнне.

У 2017 годзе па віне кіроўцаў усіх відаў транспарту адбылося 79 % ад агульнай колькасці ДТЗ, па віне пешаходаў — 15 %, па віне веласіпедыстаў — 4 %. Асноўныя прычыны ДТЗ па віне вадзіцеляў: парушэнні правілаў праезду пешаходных пераходаў, перавышэнне хуткасці, незахаванне чарговасці праезду скрыжаванняў.

Казаў ён і пра меры, якія былі прынятыя не так даўно. Напрыклад, узмацненне ў 2013 годзе жорсткасці адміністрацыйнай і крымінальнай адказнасці за кіраванне транспартным сродкам у стане ап'янення. Да чаго гэта прывяло? За пяць гадоў колькасць затрыманых нецвярозых кіроўцаў зменшылася ў два разы, колькасць ДТЗ па іх віне скарацілася на 36 %, колькасць загінулых і параненых у іх зменшылася больш чым у два разы. Разам з канфіскацыяй аўто меры далі сапраўды добры вынік, што пацвярджае статыстыка.

Калі пасля выступлення ў прысутных спыталі, ці ёсць у іх пытанні, узняўся сапраўдны лес рук. Прыводзім найбольш цікавыя пытанні і адказы на іх.

Чаму самае бяспечнае месца на дарозе — пешаходны пераход — зыходзячы са статыстыкі становіцца самым небяспечным? Рашэнне праблемы, па словах Аляксандра Цагельніка, відавочнае — будаўніцтва пешаходных пераходаў розных узроўняў, але ёсць складанасці з фінансамі.

У рамках нарады заяўлялася аб дэфіцыце парковачных месцаў — аднак адзін з дэпутатаў справядліва заўважыў, што паркінгі ў сталіцы стаяць пустыя, а вуліцы застаўленыя аўтамабілямі. Як людзей перавесці на гэтыя месцы, пацікавіўся ён. Адказ МУС быў красамоўны: колькасць транспартных месцаў, зарэгістраваных у Мінску, — амаль 700 тысяч, а парковачных месцаў — больш за 400 тысяч. Гэта значыць, нават калі б усе, хто жадае, захацелі паставіць аўто не на праезнай частцы і не ў дварах, то дэфіцыт быў бы значны. Таму рэзкае павелічэнне мер адказнасці, накладанне штрафаў і пастаянныя эвакуацыі толькі ўзмоцняць сацыяльнае напружанне, а не вырашаць праблемы, упэўнены спецыяліст.

Пытанне па налічэнні балаў: калі парушэнне фіксуецца тэхнічнымі сродкамі, то згодна з прапанаванымі папраўкамі за гэта кіроўца атрымлівае толькі адзін бал. Калі ж супрацоўнік ДАІ спыняе кіроўцу за тое ж парушэнне, колькасць балаў можа быць вышэйшая. Што за няроўнасць? У адказ Аляксандр Цагельнік адзначыў, што ёсць вялікая розніца: інспектар выяўляе кіроўцу, які кіраваў асабіста, а вось тэхнічныя сродкі фіксуюць толькі аўтамабіль і ўласніка, які мог і не кіраваць транспартным сродкам у момант фатаграфавання.

Напарадзе чакае яшчэ нямала круглых сталоў і сустрэч па гэтай тэме, пра што мы абавязкова раскажам у будучых нумарах.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.

❍ Каментарыі ў тэму

Намеснік начальніка ўпраўлення дзяржаўнага міжнароднага права галоўнага дзяржаўна-прававога ўпраўлення Адміністрацыі Прэзідэнта Арцём ПРАСКАЛОВІЧ:

— Прынцыповых пярэчанняў у нас на цяперашні момант няма. Адзінае, хацелася б прапанаваць падумаць дадаткова над некаторымі працэдурамі рэалізацыі гэтай сістэмы.

З улікам таго, што яна ахопіць вельмі шырокае кола людзей і гэта нейкі новы механізм, то мы б прапанавалі хоць бы на першым этапе адысці ад поўнай аўтаматызацыі гэтага працэсу. Чаму? Напрыклад, чалавек паехаў па брэсцкай трасе за мяжу, нахапаў штрафаў па фотафіксацыі на 15 балаў, з'ехаў. А калі вярнуўся, то даведаўся, што, аказваецца, ужо некаторы час ён не мае права на кіраванне аўтамабілем. Да гэтага яшчэ дадасца парушэнне за кіраванне без права кіравання.

Гэта значыць, трэба максімальна хутка інфармаваць аб правапарушэннях і адпаведных балах. Чалавек павінен адразу разумець, якія наступствы могуць паўстаць.

Хацеў бы звярнуць увагу: мы гаворым пра тое, якія наступствы гэтага закона для бяспекі дарожнага руху. Сітуацыя такая: адна з асноўных прычын ДТЗ з цяжкімі наступствамі і гібеллю людзей — гэта перавышэнне хуткаснага рэжыму. У першую чаргу мы кажам пра тое, што выратуем пяць чалавечых жыццяў за год, увёўшы бальную сістэму, і прымусім восем чалавек задумацца пра тое, што яны могуць быць пазбаўлены права кіравання. Ніхто не кажа пра тое, што ўсе павальна перастануць парушаць. Але гэтыя навіны законапраекта — гэта разумны крок, паколькі ён дазволіць захаваць жыцці пяці чалавек.

Член назіральнага савета сумеснага закрытага акцыянернага таварыства «Бяспечныя дарогі Беларусі» Дзмітрый КУРНОСЕНКА:

— Комплексны падыход, сістэмнасць — гэта, напэўна, залог поспеху. Гэты закон павінен стварыць умовы, каб падобны падыход быў рэалізаваны. На жаль, аднымі тэхнічнымі сродкамі і кантролем дамагчыся стапрацэнтнага выніку немагчыма.

Калі мы звернем увагу на статыстыку, то ўбачым, што сітуацыя стабілізавалася, значнага зніжэння паказчыкаў ужо няма. Гэта сведчыць аб тым, што ад фіксацыі неабходна пераходзіць да іншых прынцыпаў — напрыклад, ствараць так званыя бяспечныя калідоры. Гэта значыць, фіксацыя будзе адбывацца яшчэ і ў тых месцах, якія ўяўляюць патэнцыйную небяспеку.

ШЛЯХ ДЛЯ ВАДЫ

Падпраграма «Чыстая вада» праграмы «Камфортнае жыллё і спрыяльнае асяроддзе» на 2016—2020 гады, што дзейнічае ў нашай краіне, — лагічны працяг шматгадовай працы па павышэнні якасці пітной вады для насельніцтва, удасканаленні працы ачышчальных сістэм, ахове ад забруджвання падземных і паверхневых вод. Дзякуючы праведзенай рабоце цяпер вадой з сістэм цэнтралізаванага водазабеспячэння, якая адпавядае пітной якасці, карыстаецца 83,7 % спажыўцоў. У 2020 годзе гэты паказчык павінен дасягнуць 100 %. Але пакуль не ўсе праблемы ў гэтай сферы вырашаюцца паспяхова.

Дзе шукаць забруджвальнікаў?

Якасць вады — асноўнае з пытанняў, якія хвалюць жыхароў розных рэгіёнаў краіны. Сёння за тым, каб вада адпавядала гігіенічным нарматывам, сочаць у тым ліку і ў межах Нацыянальнай сістэмы маніторынгу навакольнага асяроддзя. Для паверхневых і падземных вод ён праводзіцца з 1993 года. Паводле даных за 2017 год, за гэты час фізіка-хімічны склад падземных вод (а менавіта вада з гэтых крыніц пераважна трапляе ў кватэры беларусаў) практычна не змяніўся і ў цэлым адпавядае патрабаванням СанПіН. Выключэнне складаюць адзінкавыя выпадкі перавышэння колькасці вокісу крэмнію, аміяку і марганцу. Прыродны фактар, які больш за ўсё ўплывае на якасць вады, — перавышэнне гранічна дапушчальных канцэнтрацый па жалезе.

Праблема «жалезнай» вады вырашаецца з дапамогай станцый абезжалезвання. Так, за гады дзеяння праграмы «Чыстая вада» (з 2002-га да 2015 года) у краіне было пабудавана больш за 1000 такіх станцый. Яшчэ 500 плануецца пабудаваць да 2020 года ў межах аднайменнай падпраграмы.

Але для эфектыўнага вырашэння гэтай праблемы важна не толькі сачыць за крыніцамі водазабеспячэння — неабходна падтрымліваць і добры стан водаправоднай сістэмы. Эксплуатацыя старых трубаправодаў і недастатковая колькасць іх санітарных прамывак нават добрую ваду могуць зрабіць іржавай, а часам і прывесці да аварый.

> Паводле даных Мінпрыроды, узнаўляльныя рэсурсы падземных вод у цэлым па рэспубліцы вызначаны ў памеры 43,56 мільёна «кубоў» на суткі. Штогод з прыродных крыніц здабываецца каля 1500 мільёнаў кубічных метраў вады. Асноўныя яе аб'ёмы ідуць на гаспадарча-пітныя патрэбы (38,7 % ад агульнага аб'ёму выкарыстанай вады), на вытворчыя патрэбы (26 %) і патрэбы рыбнай сажалкавай гаспадаркі (26,4 %).

Уплываюць на якасць вады і антрапагенныя фактары. Так, з-за недасканалай дзейнасці сельскагаспадарчых арганізацый па ахове навакольнага асяроддзя і неабачлівасці некаторых грамадзян пітная вада ў калодзежах забруджваецца нітратамі. Крыніцамі гэтых азотазмяшчальных злучэнняў звычайна з'яўляюцца арганічныя і мінеральныя ўгнаенні, якія ўносяцца на палі, ці размешчаныя побач гаспадарчыя пабудовы (хлявы, прыбіральні) без неабходнай аховы. Трапляючы ў арганізм чалавека, нітраты зніжаюць імунітэт, павышаюць успрымальнасць да прастудных захворванняў, уплываюць на крывятворную сістэму. Асабліва небяспечныя яны для дзяцей.

Фота БелТА.

Камунальныя ачышчальныя збудаванні сёння часта прымаюць на сябе цяжар неачышчаных вытворчых сцёкавых вод.

Калі грамадскія калодзежы і якасць вады ў іх знаходзяцца пад дзяржаўным санітарным наглядам і абслугоўваюцца спецыялізаванымі арганізацыямі, то асабістыя — галаўны боль іх уласнікаў. Каб засцерагчыся ад праблем са здароўем, менавіта самі грамадзяне павінны звяртацца ў цэнтры гігіены і эпідэміялогіі ці іншыя акрэдытаваныя арганізацыі для праверкі бяспечнасці вады ў такіх крыніцах, чысціць і пры неабходнасці рамантаваць калодзежы.

Свідравін шмат не бывае?

Здабыча вады таксама можа стаць адной з крыніц яе забруджвання, лічаць у Мінпрыроды. Многія грамадзяне і арганізацыі аддаюць перавагу асабістым сістэмам водазабеспячэння і бураць на сваіх зямельных участках свідравіны — як уласнымі сіламі, так і з дапамогай спецыялізаваных арганізацый. Пры гэтым па розных прычынах не ўсе такія збудаванні прыносяць чаканыя вынікі: вады са свідравіны ці калодзежа можа паступаць менш, чым планавалася, або ў выніку выкарыстання нетраў можа адбыцца забруджванне падземных вод.

Менавіта таму ў Мінпрыроды звярнулі ўвагу на неабходнасць вырашэння праблемы масавага і бескантрольнага бурэння свідравін. У прыродаахоўным ведамстве ўпэўнены: неабходна палепшыць дзяржаўны кантроль за такім водакарыстаннем. Сёння гэта пытанне разглядаецца пры карэкціроўцы закона «Аб пітным водазабеспячэнні».

Куды цякуць сцёкі

Па словах **начальніка аддзела выкарыстання і аховы водных рэсурсаў Мінпрыроды Таццяны СЛІЖ,** неабходна таксама вырашыць і праблему ачысткі вытворчых сцёкавых вод, якія адводзяцца ў сеткі камунальнай каналізацыі:

— Водным кодэксам Рэспублікі Беларусь устаноўлена: калі немагчыма забяспечыць дапушчальную канцэнтрацыю забруджвальных рэчываў у складзе вытворчых сцёкавых вод, якія скідваюцца ў паверхневыя водныя аб'екты, неабходна наладзіць лакальныя ачышчальныя збудаванні. Аднак на практыцы гэта патрабаванне не заўсёды выконваецца. Большасць прадпрыемстваў адводзіць вытворчыя сцёкавыя воды ў сістэму каналізацыі населеных пунктаў без папярэдняй ачысткі. Тым самым яны негатыўна ўплываюць на работу камунальных ачышчальных збудаванняў і, адпаведна, на якасць паверхневых і падземных вод.

Пры гэтым, адзначае спецыяліст, назіраецца тэндэнцыя да скарачэння аб'ёму скіду недастаткова ачышчаных сцёкавых вод у паверхневыя водныя аб'екты. У адносінах да 2000 года паказчык зменшыўся на 16,2 мільёна кубічных метраў, ці на 65 %.

Выкарыстоўваючы — зберагаць

За апошнія гады ў Беларусі значна скараціласа водаспажыванне — як на гаспадарча-пітныя, так і на вытворчыя патрэбы. Тэхналогіі паўторна-паслядоўнага выкарыстання вады, укараненне яе прыборнага ўліку дапамагаюць рацыянальна выкарыстоўваць гэты важны прыродны рэсурс. Але каб пытанні водазабеспячэння вырашаліся яшчэ больш эфектыўна, неабходны ўдзел кожнага жыхара краіны.

Вераніка КОЛАСАВА.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

СІТУАЦЫЯ

ЧАМУ ПЕРАКРЫЛІ ВЕНТЫЛЬ?

Жыхары Капцёўкі просяць вярнуць ім ваду з калгаснай свідравіны, камунальныя службы — супраць

Вось ужо трэці месяц, як у вёсцы Капцёўка Гродзенскага раёна пачаліся праблемы з вадой. Яна цячэ мутная і ржавая. Гэта здарылася пасля таго, як насельніцтву сталі падаваць ваду з іншай свідравіны. Жыхары забілі трывогу, пачалі звяртацца ў розныя інстанцыі. Якім чынам будзе вырашацца балючае пытанне, высвятляла карэспандэнт «Звязды».

«СТАНЕШ У ВАННУ — НОГ НЕ ВІДАЦЬ!»

Жыхары аграгарадка Капцёўка ўзрушаны. І гэта зразумела. Амаль усё лета яны пакутуюць з-за ржавай вады, якая цячэ з кранаў. Падчас прыезду карэспандэнта «Звязды» на вуліцы 1 Мая сабралася даволі вялікая група, большая частка якой — пенсіянеры. Многія адпрацавалі ў мясцовым калгасе дзясяткі гадоў. Раней, кажуць яны, такой востpай праблемы з вадой не было. Зрэдку здараліся перабоі, хаця водаправод існуе больш за 50 гадоў. Людзі стаміліся скардзіцца на стан вады, але ў размове з карэспандэнтам не хаваюць эмоцый.

— Вада не толькі мутная і ржавая, але і быццам з нейкім тлушчам, непрыемна пахне, — кажа адна з жанчын.

— Дзіця купаць у такой вадзе небяспечна, — уступае ў размову маладая мама з дзіцем на руках, — не кажучы пра тое, каб гатаваць на ёй ежу.

— Страшна нават ногі мыць — іх не відаць у такой вадзе, — чуецца голас з натоўпу.

— Да нас прыязджаюць з горада дзеці і ўнукі, яны вымушаны везці з сабой багажнік вады, ды і мы самі карыстаемся бутэляванай вадой альбо ідзём да суседзяў, дзе ёсць калодзеж, — устаўляе рэпліку мужчына сталага веку.

Жыхары дэманструюць ваду, якую толькі што набралі з-пад крана. Вадкасць у белым вядры і ПЭТ-бутэльцы не назавеш празрыстай, і піць яе няма ніякага жадання.

Увесь час у Капцёўцы можна сустрэць людзей з вёдрамі і бутлямі. Маладая пара з пустой тарай ідзе да калодзежа, які, можна сказаць, ратуе жыхароў вуліцы. Па словах Святланы, такія рэйды па ваду трэба рабіць штодзённа: у сям'і малое дзіця, і ад іржавай вады на яго скуры з'яўляецца сып.

Марыя Кавалеўская, якая працуе медсястрой у амбулаторыі, моцна занепакоена такой сітуацыяй. Як у такіх умовах забяспечыць стэрыльнасць? У бацькоў паўстала праблема харчавання дзяцей у садку і школе. Здаецца, цярпенне жыхароў ужо канчаецца.

«ДАЙЦЕ ВАДУ, ЯКАЯ ІШЛА РАНЕЙ»

Жыхары растлумачылі: вада пагоршылася, калі ў вёску яе сталі падаваць з іншай свідравіны. Маўляў, усё пайшло ад аб'яднання калгаса і птушкафабрыкі. Тыя свідравіны, якія раней забяспечвалі Капцёўку, засталіся на балансе прадпрыемства. Зараз вада з іх паступае на птушкаферму і іншыя сельскагаспадарчыя аб'екты. А дзве іншыя свідравіны былі перададзены на баланс ЖКГ. Адна з іх аказалася з «дрэннай» вадой.

— Не зразумела, як яе здалі ў эксплуатацыю, як санітарныя службы гэта дазволілі? — задаецца пытаннем Віктар Дучэк. — Гэта вада наогул не прыдатная да ўжывання, а мы вымушаны карыстацца ёю трэці месяц. Пры гэтым для прадпрыемства хапае адной свідравіны, другая так і не працуе.

(Заканчэнне на 14-й стар. «МС».)

ЯК ЖА!

97,4 FM — Мінск, Лагойск, Смалявічы, Жодзіна.
102,4 FM — Мядзел, 102,6 FM — Крупкі, 104,2 FM — Барысаў.
104,8 FM — Капыль, Стоўбцы, Нясвіж, Клецк, Баранавічы.
105,3 FM — Салігорск, Слуцк, Любань.
105,5 FM — Беразіно, Чэрвень. 105,6 FM — Старыя Дарогі.
107,4 FM — Маладзечна, Вілейка, Валожын.

Вы думаеце, што ў новым сезоне мы, «Мінская хваля», будзем ранейшымі? Як жа! У нас зменіцца самае галоўнае — так званая адзежа радыё: адбіванні, джынглы, лайнеры, прома-ролікі, свіперы, бамперы, брыджы і ўсё, што надае радыёстанцыі індывідуальнасць.

І пішуць-складаюць нам усю гэтую музычную прыгажосць у вельмі вядомай студыі вельмі вядомыя людзі, і тайна гэтая вялікая ёсць, таму што нам вельмі хочацца сюрпрызаў — бо мы пасля 4 верасня ўступаем у юбілейны год. Пятнаццаты! Так што чакаем усіх да нас 4 верасня з віншаваннямі і падарункамі, а падарункі мы любім — і самі дорым, а як жа! Штодня прычым. Таму што ніякімі заробкамі і ганарарамі не аплаціць тую цеплыню, з якой нашы супрацоўнікі з шасці раніцы і да дванаццаці ночы дзеляцца з вамі навінамі, прагнозамі, расказамі пра ўсё на свеце.

Але вось з чаго не будзем рабіць тайну, дык гэта з нашага новага слогана, бо ён нам усім вельмі падабаецца. Думаеце, слоган — гэта проста? Не, гэта доўгі працэс, гэта і мазгавы штурм, гэта прагаворванне ўголас дзясяткаў варыянтаў, і ў выніку нараджаецца просты і зразумелы, як вада і паветра, і адзіна правільны менавіта для нашага радыё дэвіз: «Вялікае радыё малой радзімы!» Так, гэта мы! Таму што толькі менавіта мы расказваем вам штодня пра навіны малой радзімы — ад, дапусцім, навіны пра святара з пасёлка Міханавічы, блог якога чытаюць дзясяткі тысяч чалавек, да навіны пра сыравара ў вёсцы Красноўка Крупскага раёна, які варыць казіныя сыры па італьянскай тэхналогіі ў простай дзедавай хаце.

А вось у новым сезоне — дарэчы, а вы ведаеце, чаму новы сезон на радыё пачынаецца менавіта восенню? Я адказу не знайшла нідзе... І тым не менш — традыцыйна ва ўсіх новы сезон з верасня — акрамя фінансістаў, зрэшты. Дык вось, у новым сезоне ў нас з'явіцца новыя праграмы. Дарэчы, адна «ластаўка» ўжо гучыць — навіны Мінскага раёна кожную пятніцу, пачынаючы з 7.45.

Дзмітрый АНІСАВЕЦ:

— Інфармацыйна-аналітычны складнік радыёстанцыі да новага сезона крыху мадэрнізуецца. Здавалася б, што можна ўдасканальваць у выпуску навін, які выходзіць у пачатку кожнай гадзіны? Адказ: плойму ўсяго! Хочам вяшчаць карацей, ярчэй і каб запаміналася! Што ж датычыцца праектаў, тыя, што вызначаюць наш стыль і накіраванасць праграмы, застануцца, але абавязкова з'явяцца новыя, якія ў мог бы ахарактарызаваць як праграмы «на злобу дня». З улікам крыміналістычнай абстаноўкі ў цэнтральным рэгіёне, якая па-ранейшаму застаецца няпростай, плануем запусціць праграму «Гэта ваш участковы», аўтара праекта пакуль раскрываць не будзем. Таксама «Мінская хваля» супрацоўнічае з большасцю міністэрстваў, службаў, устаноў і агенцтваў краіны, але з Нацыянальным прэс-цэнтрам, здаецца, крышачку больш. Выношваем планы стварэння сумеснай рубрыкі ў новым сезоне (падрабязнасці пакуль раскрываць таксама не будзем). І вядома, не пакінем без увагі галоўную спартыўную падзею Беларусі, якая адбудзецца ў сталіцы ў чэрвені 2019 года — другія Еўрапейскія гульні. Плануем праграму, прысвечаную падрыхтоўцы да гэтага грандыёзнага мерапрыемства краіны ўвогуле і Мінскай вобласці ў прыватнасці.


«Мінская хваля» — радыё тваёй мары!

Тамара ВЯЦКАЯ:

— Інтрыга пратрымалася нядоўга... Павел Шэін, наш малады супрацоўнік, будзе рабіць праграму «Гэта ваш участковы», і вось як ён вызначае канцэпцыю: «Гэта не проста чалавек. Гэта адначасова следчы, настаўнік, псіхолаг у адной асобе. Кожны дзень на яго плечы ўзвальваецца груз людскіх просьбаў і скаргаў. Ён дапаможа і выслухае, не пакіне ў бядзе. Мудры і клапатлівы сусед — ваш участковы. І я, Павел Шэін, буду расказваць вам пра вашага ўчастковага».

З новага ў эфіры яшчэ задумка такая: «Гутаркі пра вечнае». Вось тут ужо я падтрымаю інтрыгу, таму што вельмі шмат ахвотных проста пагаварыць, проста выказаць сваё меркаванне. Мы будзем гаварыць утраіх, дзе трэці чалавек будзе госцем і два вядучых. Ідэя не новая, але на «Мінскай хвалі» гэтага не было.

Наталля СТРЫЖАК:

— Як па мне, то ў новым сезоне на нашым радыё хочацца ў эфіры больш забаўляльных праграм, інтэрактыву. Я як аматар прыгожага буду толькі рада падобным праектам. А так усё крута! А я хацела б рабіць праграму пра ролю музыкі ў жыцці вядомых асоб нашай краіны (акцёраў, спартсменаў, журналістаў і г. д.) у прамым эфіры. Можна наогул пра тры рэчы са свету мастацтва, якія так ці інакш уразілі героя. Але песня абавязковая. Будзем яе слухаць у эфіры.

Каця ЛАПІЦКАЯ:

— У новым сезоне я хачу даносіць да нашых любімых слухачоў усё абсалютна па-новаму. Гэта датычыцца як выпуску навін, так і аўтарскіх праграм, у прыватнасці «Няпроста людзі». Каб любая інфармацыя слухалася на адным дыханні, каб яна была цікавая і, магчыма, камусьці ў чымсьці дапамагла. Новы сезон — гэта заўсёды нешта трапяткое і хвалюючае, бо менавіта ў гэты момант ад кожнага з нас чакаюць чагосьці нетыповага, цікавага і нават незвычайнага. І я, Каця Лапіцкая, зраблю ўсё, каб не падвесці ўжо даўніх слухачоў «Мінскай хвалі», а таксама паспрабую дапамагчы прыслухацца да нас новых.

Тамара ВЯЦКАЯ:

— Бо, калі шчыра, самае галоўнае для нас — каб нас слухалі. Вось на ўсіх інтэрнэт-рэсурсах мы ўжо пачалі даваць навіны больш даходліва, гэта ўжо новы сезон. Яшчэ, хутчэй за ўсё, з'явіцца новы дыджэй, які штодня будзе весці гадзінную праграму аб усіх кірунках музыкі, пра кампазітараў-спевакоў-музыкантаў. Мы працягнем цыкл «Гаворым правільна з «Мінскай хваляй» — шчыра скажу, што нават для мяне многае было адкрыццём у філалогіі, так цікава робіць рубрыку васьмігадовы вундэркінд Гоша Куніцкі. Працягнем «Азбуку здароўя» — ці ведаеце вы, што кавун выведзе з вашага арганізма ўсё дрэннае, але пакіне ўсё добрае? Слухайце «Азбуку здароўя»...

Дарэчы нашы слухачы, чытачы і гледачы! Нашаму радыё 4 верасня 14 гадоў. У нас ёсць вы. І што мы можам гарантаваць, дык гэта тое, што ніколі не сапсуем вам настрою. А гэта таксама вельмі важна ў наш час, хіба не так?

Рэкламна-прамоўтарскі аддзел радыё «Мінская хваля»
+375 (17) 228 13 44; +375 (29) 365 50 21
reklamamv@mail.ru; reklama@mvolna.by
УНП 690262864

ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

■ Сядзі і глядзі

МУЖЧЫНСКАЕ КІНО

«Інферна»
«Беларусь 2», 8 і 9 верасня

...Спецыяліст па рэлігійных сімвалах прафесар Роберт Лэнгдан прытомнее ў адной з італьянскіх бальніц, цалкам страціўшы памяць. Мясцовы ўрач спрабуе дапамагчы вучонаму ўспомніць, што з ім адбылося, каб з яго дапамогай расшыфраваць схаваныя ў першай частцы «Боскай камедыі» Дантэ падказкі і спыніць загадкавых злачынцаў, якія збіраюцца распаўсюдзіць смяротна небяспечны вірус. Словам, прыхільнікаў творчасці Дэна Браўна трылер зацягне з першых кадраў.

«Неабдуманы»
«Кінакамедыя», 7 і 9 верасня

14-гадоваму вундэркінду Ілаю, які экстэрнам скончыў школу, з-за ўзросту адмовілі ў прыёме ў Гарвард, і ён вымушаны паступіць у трэцясортны каледж Уітмен. Тут хлопец сустракае другую крайнасць — першакурсніка Леа, якому ўжо... 41 год. Да таго ж такіх розных студэнтаў пасялілі разам у інтэрнаце, і цяпер ім проста неабходна стаць сябрамі, каб разам пастаяць за сябе.

«Не гульня»
СТБ, 9 верасня

Герой мастацкай стужкі «Беларусьфільма», прысвечанай 100-годдзю Узброеных Сіл краіны, — праграміст Аляксей, які стварае камп'ютарныя гульні, але адчувае «несапраўднасць» падзей у іх. Таму, уявіце сабе, вырашае пайсці ў армію, каб на сабе выпрабаваць хлеб танкіста і наогул вайсковыя рэаліі. Як водзіцца, вайсковая служба змяняе маладога чалавека і вонкава, і ўнутрана, і ў выніку ён знаходзіць новых сяброў, новыя мары і наогул перажывае «перазагрузку» ўсяго свайго жыцця.

«Вяртанне высокага бландзіна»
«МІР», 8 верасня

Сціплы скрыпач Франсуа Перэн, якому воляй лёсу выпала сыграць у шпіёнскія гульні, вымушаны зноў вярнуцца ў гэта амплуа. Новы міністр унутраных спраў, які раней быў міністрам сельскай гаспадаркі Францыі, знайшоў дасье на высокага бландзіна і загадаў прадставіць яму «супер-агента». Контрразведчыкі сцвярджаюць, што агент загінуў пры выкананні спецаперацыі, аднак міністр настойвае, каб цела прывезлі на радзіму, і тады найміты выпраўляюцца ў Рыа-дэ-Жанэйра, дзе Перэн мірна жыве са сваёй каханай Крысцін, каб забіць яго...

«Трое ў лодцы, не лічачы сабакі»
«8 канал», 9 верасня

Трое лонданскіх сяброў, Джордж, Гарыс і Джэй, вырашаюць вырвацца з душнага і бруднага горада на ўлонне прыроды — дакладней, зладзіць актыўны адпачынак і сплавіцца па Тэмзе на лодцы ў «чыста мужчынскай кампаніі», у якую ўваходзяць яны самі і фокстэр'ер Манмарэнсі. Ці трэба казаць, што планы аказаліся далёкімі ад рэчаіснасці і чаканы спакойны водпуск ператварыўся ў чараду прыгод і кур'ёзаў, шчодра прыпраўленых самымі рознымі эмоцыямі, гумарам і рамантыкай?

■ Тэлесеткі

Праграмны ўраджай

Агенцтва тэленавін Белтэлерадыёкампаніі рыхтуе да пачатку новага тэлесезона хранікальна-дакументальны фільм пра Белавежскую пушчу. У здымках, якія праходзілі цягам года па-за звыклымі турыстычнымі маршрутамі, прынялі ўдзел пастаянныя героі: гарадская сям'я, якая пераехала ў пушчу і цалкам змяніла лад жыцця, спалучаючы Wi-Fi з самаробным хлебам і ткацтвам. Акрамя таго, у фільме ўзялі ўдзел навукоўцы, якія даследуюць багаты свет Белавежскай пушчы: арнітолагі, беларускія ды польскія спецыялісты па паводзінах ваўкоў, а таксама зубразнаўцы.

Яшчэ адной прэм'ерай сезона ад Агенцтва тэленавін абяцае стаць вялікая суботняя праграма, назва якой пакуль трымаецца ў сакрэце: новы фармат, які спалучыць актуальныя навіны з усяго свету і іх абмеркаванне ў інтэрнэце. А ў 2019 годзе гледачам прапануюць новыя спецпраекты, прысвечаныя Году малой радзімы і Еўрапейскім гульням, а таксама шматсерыйны цыкл фільмаў «Лёс гігантаў 5».

Хто запаліць сваю зорку на «Еўрабачанні»?

Ужо сёння ў Белтэлерадыёкампаніі пройдзе фінальны галаканцэрт нацыянальнага адбору на дзіцячае «Еўрабачанне-2018». Нашага прадстаўніка на міжнародным творчым спаборніцтве гледачам і журы давядзецца выбіраць сярод 10 канкурсантаў. На сцэну яны выйдуць у наступным парадку: гурт «Мята», Даніэль Алекс Яструмскі, Елізавета Мея, Арцём Скароль, Ангеліна Ярашчук, вакальны гурт Monkey Tops, Марыя Жыліна, Яраслаў Саколікаў, Мікіта Бялько, Марыя Гулевіч.

Глядацкае галасаванне за ўпадабаных кандыдатаў пачнецца адразу пасля выступлення ўсіх канкурсантаў і прадоўжыцца 10 хвілін — нумары, па якіх прымаюць званкі і sms-паведамленні, абвесцяць вядучыя канцэрта Тэа і Вольга Рыжыкава.

Вікторыя ЗАХАРАВА

Беларусь 1

6.00, 7.20, 8.15 «Добрай раніцы, Беларусь!»
7.00, 8.00 (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 1.10** Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10, 18.15, 0.50 «Зона Х». (16+).
9.10 «Галоўны эфір».
10.20, 12.10, 18.35, 19.20 Серыял «Кветкі дажджу». (16+).
12.40, 13.05, 15.25 Меладрама «Нявеста з Масквы». (12+).
15.15, 18.00 Навіны рэгіёна.
17.05 «Беларуская часінка».
21.00 «Панарама».
21.50 Спецыяльны рэпартаж (12+).
22.10 Серыял «След» (16+).
0.30 «Арэна».
1.30 «Дзень спорту».

Беларусь 2

7.00 «Тэлераніца» (12+).
9.00, 18.35, 22.10 «Тэлебарометр».
9.30, 20.00 Серыял «Зразумець. Дараваць» (16+).
10.35 «Капейка ў капейку» (12+).
11.15 «Камень, нажніцы, папера» (16+).
11.50 «Спатканне для мамы». (12+).
12.50 «Свет навыварат. Японія». (16+).
Раз на месяц спецыялісты раённага цэнтра гігіены і эпідэміялогіі праводзяць выбарачны маніторынг. Гэта значыць, у той ці іншай вёсцы раёна бяруцца пробы і праводзіцца хіміка-біялагічны аналіз вады з калодзежаў. Калі ёсць праблемы — а найчасцей гэта перавышэнне дапушчальнай нормы нітратаў, — адразу паведамляецца кіраўніцтву сельскага Савета. Людзей папярэджваюць, ім даецца рэкамендацыя не ўжываць ваду для піцця і прыгатавання ежы, а пераходзіць на прывазную бутэляваную ваду.

Кіраўнікі мясцовай улады адзначаюць, што людзі апошнім часам праяўляюць зацікаўленасць да праблемы і свядома падыходзяць да яе вырашэння. Некаторыя гаспадары прабіваюць свідравіну на падворку, устанаўліваюць калонку, а калодзеж, бывае, пакідаюць для тэхнічных патрэб, напрыклад для паліву агарода. У калонках жа, як правіла, вада чыстая, глыбіня адыгрывае станоўчую ролю.

І калонку, і калодзеж мае шэраг гаспадароў у вёсцы Сенькавічы Жабінкаўскага раёна. А ў Яўгена Лаготы на падворку толькі калодзеж. Яўген Рыгоравіч расказаў, што гэты дом пабудаваў яго бацька, ён жа капаў калодзеж. «Прывык, што з дзяцінства піў гэтую ваду, яна заўсёды падавалася смачнай і чыстай», — кажа гаспадар. І толькі нядаўна па рэкамендацыі сельскага Савета праверыў ваду ў лабараторыі. Цяпер можна не сумнявацца ў яе якасці.

— У XXI стагоддзі чалавек павінен ведаць паказчыкі якасці вады, якую ўжывае, — лічыць **намеснік старшыні Кобрынскага райвыканкама Аляксандр МАРТЫНЮК.** — Варта сказаць, што большасць насельніцтва праяўляе свядомае стаўленне да праблемы. Сёння ёсць усе магчымасці заказаць платную паслугу па праверцы якасці вады. Не такія гэта вялікія грошы. І кожны адказны за сваю сям'ю грамадзянін так робіць.

Глабальнае вырашэнне пытання чыстай вады для сельскага насельніцтва — гэта, несумненна, водаправод. Вада, якая паступае з сетак, пастаянна кантралюецца, што становіцца пэўнай гарантыяй. Зараз у раёне вядзецца работа ў гэтым кірунку. Разглядаецца магчымасць пракладкі водаправода ў вёсцы Брылёва. А калодзежная вада нярэдка выклікае нараканні. Літаральна днямі мы з начальнікам аддзела цэнтра гігіены і эпідэміялогіі Ігарам Асташэвічам прайшліся з алоўкамі па карце раёна. Вызначаны населеныя пункты, у якіх будуць праведзены выбарачныя праверкі. І недзе да канца года ў райвыканкаме падвядзём вынікі, намецім шляхі вырашэння. У малую аддаленую вёску, вядома, сеткі не пацягнеш. Магчыма, паўстане пытанне аб забеспячэнні жыхароў бутэляванай вадой. Бо гэта непарадак, калі каровы часам п'юць ваду больш якасную, чым людзі. Пры цяперашніх патрабаваннях малочных заводаў аграрыі пастаянна правяраюць ваду з воданапорных вежаў. У абсалютнай большасці сельгаспрадпрыемстваў вада каля фермаў здабываецца чыстая. А ў калодзежах, як паказвае практыка, бывае і з нітратамі.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

У ТЭМУ

Нітраты — адна з формаў азоту. Солі азотнай кіслаты з'яўляюцца кампанентамі мінеральных угнаенняў (напрыклад, калійнай альбо аміячнай салетры). Асабліва небяспечныя нітраты, якія трапляюць у арганізм з вадой, бо ваду мы ўжываем штодня.

Трапляючы ў арганізм, нітраты ператвараюцца ў нітрыты. Апошнія злучаюцца з гемаглабінам, які пераносіць кісларод да тканак. Нітрыты робяць гемаглабін неактыўным. Узнікаюць кіслароднае галаданне ўсіх органаў, авітаміноз, хваробы шчытападобнай залозы. Асабліва небяспечныя нітраты для дзяцей.

ЧАМУ ПЕРАКРЫЛІ ВЕНТЫЛЬ?

(Заканчэнне. Пачатак на 4-й стар. «МС».)

Віктар Мікалаевіч — актывіст, што называецца, ад бязвыхаднасці. Ён неаднаразова звяртаўся з вясковай праблемай да раённых і абласных улад, а таксама ў занальны і абласны цэнтры гігіены і эпідэміялогіі. У лісце ад санітарных службаў гаворыцца, што водазабеспячэнне жылых дамоў у аграгарадку Капцёўка адбываецца з гаспадарча-пітнога водаправода ЖКГ Гродзенскага раёна. Указваецца, што сістэма водападрыхтоўкі на водаправодзе адсутнічае. Дарэчы, раней вада паступала ад Гродзенскай птушкафабрыкі.

Што датычыцца лабараторных даследаванняў, то пробы вады з камунальнага водаправода адпавядаюць мікрабіялагічным нормам. А вось мутнасць і колькасць жалеза значна перавышаюць нарматывы. Напрыклад, жалеза — у восем разоў. Пры гэтым ніякія меры па ачыстцы і прамыўцы водаправода не далі вынікаў.

Наогул наяўнасць жалеза ў падземным гарызонце характэрная для ўсёй краіны, у тым ліку для Гродзенскага раёна. Звычайна з такой сітуацыяй спраўляюцца станцыі абезжалезвання альбо спецыяльныя фільтры непасрэдна ў жылых дамах.

— Напачатку нам сказалі, што будаўніцтва станцыі ў Капцёўцы запланавана на 2019 год. Гэта значыць, што нам яшчэ добры год карыстацца ржавай вадой, — кажа Віктар Дучэк. — Таму мы звярнуліся з просьбай уключыць тую свідравіну, якой мы карысталіся да гэтага часу. Але ў санстанцыі адказалі, што ў той вадзе значнае перавышэнне па нітратах. Да таго ж свідравіна, якая зараз належыць птушкафабрыцы, не мае агароджы, знаходзіцца ў дрэнным стане.

Жыхары, як адзін, упэўнены: вада, якой карысталіся раней, была чыстая і празрыстая. І пытанне па нітратах ніколі не стаяла так востра. Людзі перакананыя, што вырашэнне праблемы ляжыць на паверхні. Трэба толькі двум уладальнікам высветліць, хто каму будзе плаціць, і вярнуць былую схему. Насельніцтва ж плаціць за чыстую ваду, а не за брудную... З такімі разважаннямі я завітала ў Капцёўскі сельскі Савет.

«НЕЛЬГА ПАІЦЬ НАРОД НІТРАТАМІ»

Мне пашанцавала. **Старшыня сельсавета Іван СЛІЖЭЎСКІ** якраз быў на месцы. У адказ на пытанне «Як вырашаецца праблема з вадой?» Іван Яўгенавіч працягнуў мне пратакол даручэнняў губернатара ад 20 жніўня гэтага года. У ім сярод іншага быў і пункт, які датычыўся Капцёўкі. Адказным асобам было прадпісана набыць і змантаваць абсталяванне для станцыі абезжалезвання да канца 2018 года. Гэта значыць, што станцыя будзе пушчана ў дзеянне ў паскораным рэжыме, амаль на год раней тэрміну. Практычна за некалькі месяцаў.

Старшыня сельскага Савета ведае сітуацыю, але паўплываць на яе не ў стане. Вада, якая паступае на птушкафабрыку, змяшчае нітратаў 58,4 мг/л пры норме 45. Для фермы гэта дапушчальная забруджанасць, а для насельніцтва — небяспечная. Таму браць на сябе адказнасць за вяртанне насельніцтву «нітратнай» свідравіны ён не збіраецца. Разам з тым пытанне аб паляпшэнні пітной вады з парадку дня не здымаецца. На думку Івана Сліжэўскага, на стан водаправода ў гаспадарцы даўно трэба было звярнуць увагу. Чаму 50 гадоў трубы не мянялі?

— Я тут восем гадоў працую, і ўвесь час вяліся ўгаворы: перадавайце водаправод на баланс ЖКГ, вы яго не эксплуатуеце, і гэта не ваша работа. Але ніхто гэтага не рабіў, пакуль не прыйшоў новы кіраўнік, — зазначыў старшыня сельсавета.

Па яго словах, на баланс птушкафабрыкі была перададзена кацельная, зроблены праект і ідзе замена цеплатрасы. Сёлета і на будучы год будуць добраўпарадкаваны свідравіны, пачнецца замена водапровада. Забяспечваць насельніцтва вадой гаспадарцы не пад сілу: гэта пагражае адключэннем вады ў вёсцы. Таму было прынята рашэнне перадаць на баланс ЖКГ дзве свідравіны, а дзве пакінуць на ўласныя патрэбы. Гэта тыя самыя «нітратныя», якія раней забяспечвалі вёску. Ізноў будуць ачышчаць труба-правод, гэту работу будзе праводзіць раённае ЖКГ.

— Рана ці позна, праблема гэта выйшла б напаверх, — зазначыў Іван Сліжэўскі. — Зараз яна можа вырашыцца хутчэй, бо паскорыцца будаўніцтва станцыі абезжалезвання. Пакуль яе няма, у школе і садку ставяцца фільтры для ачысткі вады.

Дырэктар сярэдняй школы Людміла САНЮКЕВІЧ паведаміла, што фільтры ўжо закуплены за кошт аддзела адукацыі райвыканкама. Да пачатку навучальнага года іх усталююць.

«СІТУАЦЫЯ З ВАДОЙ — АБУРАЛЬНАЯ»

Стан вады ў Капцёўцы пад пастаянным кантролем санітарных службаў. Пробы бяруцца амаль штотыдзень. Вядзецца назіранне за прамыўкай водаправодных сетак. Але гэта ненадоўга паляпшае сітуацыю, бо жалеза ўсё роўна назапашваецца ў водаправодзе.

На думку **галоўнага санітарнага ўрача вобласці Мікалая КЕНДЫША,** сітуацыя з вадой у Капцёўцы склалася абуральная. На тэрыторыі населенага пункта, аказваецца, не чатыры, а восем свідравін. Але адна не працуе, другая — закансерваваная, трэцяя — затампаніраваная... Вельмі цяжка разабрацца ў тэхнічных магчымасцях свідравін, якія маюць розных уладальнікаў, адзначыў Мікалай Кендыш. Праблема, якая сёння турбуе людзей, крыецца ў мінулым, калі калгас «разбазарваў» свідравіны, і ЖКГ цяпер не хоча іх браць на баланс з-за дрэннага стану.

Мікалай Кендыш прызнае: камунальнікі дапусцілі памылку, бо пераключылі свідравіны без усялякага аналізу сітуацыі і яе наступстваў. Да таго ж неабходна было правесці інфармацыйную работу з насельніцтвам, а потым прымаць меры і пераключаць той вентыль. Гэта зроблена не было. У сваю чаргу, жыхары, якія атрымалі ржавую ваду, не хочуць мірыцца з такой сітуацыяй. Дарэчы, у вобласці некалькі сотняў населеных пунктаў, куды паступае вада з перавышэннем колькасці жалеза. Актуальная і тэма нітратаў. Галоўны санітарны ўрач канстатуе: гэтыя рэчывы перавышаны ў былой свідравіне, але спынілі яе эксплуатацыю яшчэ і з-за недахопу вады.

Зараз камунальныя службы тэрмінова шукаюць шляхі вырашэння гэтых праблем. Па словах **генеральнага дырэктара ЖКГ Гродзенскай вобласці Алега ШАФРАНСКАГА,** пазбегнуць уздзеяння нітратаў, магчыма, калі паглыбіць свідравіны, і гэта часткова зроблена. Але ўзнікла праблема жалеза. Для яго ачысткі неабходна пабудаваць станцыю, і на гэта выдзелена 42 тысячы рублёў. Алег Шафранскі ўпэўнены, што модуль будзе ўведзены ўжо ў лістападзе. Але для вырашэння праблемы неабходна будаваць воданапорную вежу з рэзервуарам чыстай вады. Тады можна гаварыць аб бесперабойнай яе падачы.

Відавочна, што сітуацыя з іржавай вадой — гэта безгаспадарчасць былых уладальнікаў свідравін і недальнабачнасць сённяшніх. Можна бясконца раскладваць гэту праблему па частках, і яны быццам бы даволі лагічныя. Гэта і старыя сеткі, і нітраты, і недахоп вады... Але расплачваюцца за гэтыя хібы чамусьці жыхары вёскі, а іх — ні многа, ні мала — каля тысячы чалавек.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

КАМПЕТЭНТНА

МОЖНА НЕ КІПЯЦІЦЬ

Ці можна піць ваду з-пад крана без кіпячэння, колькі ў ёй можа змяшчацца жалеза і ці бяспечнае яно для нашага здароўя, а таксама хто павінен сачыць за якасцю вады з калодзежа — пра гэта расказалі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя.

— Згодна з санітарнымі правіламі і нормамі пітная вада, якая падаецца цэнтралізаванымі сістэмамі, павінна быць эпідэмічна бяспечнай, бясшкоднай па хімічным складзе і валодаць спрыяльнымі арганалептычнымі ўласцівасцямі. Яна не можа змяшчаць хваробатворныя бактэрыі, вірусы і найпрасцейшыя мікраарганізмы і мусіць адпавядаць нарматывам па мікрабіялагічных і паразіталагічных паказчыках. Таксама ў вадзе не павінна быць біялагічных агентаў і хімічных рэчываў.

Абследаванні вады ажыццяўляюцца па мікрабіялагічных і санітарна-хімічных паказчыках. У адпаведнасці з рэкамендацыямі Сусветнай арганізацыі аховы здароўя вада лічыцца бяспечнай у эпідэміялагічных адносінах, калі колькасць проб, якія не адпавядаюць гігіенічным нарматывам па мікрабіялагічных паказчыках, не перавышае 5 %. У Беларусі ў 2018 годзе неадпаведнасць па названых паказчыках была зарэгістравана ўсяго ў 0,8 % проб. Таму ваду з-пад крана без кіпячэння і дадатковай ачысткі ўжываць цалкам бяспечна.

Асноўнымі крыніцамі водазабеспячэння ў краіне з'яўляюцца падземныя воды. На асобных тэрыторыях з-за гідрагеалагічных асаблівасцяў фарміравання яны характарызуюцца павышанай колькасцю жалеза. Злучэнні жалеза не аказваюць таксічнага дзеяння на арганізм чалавека, аднак садзейнічаюць павелічэнню мутнасці і колернасці, што абмяжоўвае выкарыстанне вады ў санітарна-бытавых мэтах.

Пры наяўнасці ў пітной вадзе жалеза ў канцэнтрацыі большай за 0,3—0,5 мг/л арганалептычныя ўласцівасці пагаршаюцца, а пры канцэнтрацыі вышэйшай за 1,5—2 мг/л вада, акрамя мутнасці і афарбоўкі, набывае непрыемны вяжучы смак. Таму колькасць жалеза ў водаправоднай вадзе не павінна перавышаць 0,3 мг/л. Па рашэнні мясцовых улад да правядзення адпаведных мерапрыемстваў (будаўніцтва станцый абезжалезвання, выбар новай крыніцы водазабеспячэння і інш.) можа быць устаноўлены часовы нарматыў колькасці жалеза — 1 мг/л.

У Мінску для абясшкоджвання вады часткова выкарыстоўваецца метад хларыравання. Надзейны эфект дасягаецца ў тым выпадку, калі пасля абясшкоджвання ў вадзе застаецца 0,3—0,5 мг/л свабоднага хлору ці 0,8—1,2 мг/л звязанага хлору, што сведчыць пра дастатковую колькасць уведзенага абеззаражвальнага агента. Наяўнасць рэшткавага хлору ў вадзе рэгулярна вызначаюць у лабараторыі, а таксама не радзей чым раз на суткі адбіраюць пробу вады для бактэрыялагічнага даследавання. У 2017-м і бягучым гадах па выніках лабараторных даследаванняў у пітной вадзе з размеркавальнай сеткі Мінска перавышэнняў колькасці рэшткавага хлору не выяўлена.

Што датычыцца такіх крыніц водазабеспячэння, як грамадскія шахтавыя калодзежы, то адказнасць за іх эксплуатацыю, санітарны і тэхнічны стан нясе арганізацыя, на балансе якой яны знаходзяцца. У апошнія гады назіраецца ўстойлівая тэндэнцыя па зніжэнні колькасці крыніц нецэнтралізаванага водазабеспячэння, якія не адпавядаюць устаноўленым нормам, у тым ліку і па якасці вады. За апошнія 10 гадоў іх колькасць знізілася з 15,3 % да 4,1 %.

> У Беларусі ў 2018 годзе неадпаведнасць па названых паказчыках была зарэгістравана ўсяго ў 0,8 % проб. Таму ваду з-пад крана без кіпячэння і дадатковай ачысткі ўжываць цалкам бяспечна.

Наколькі бяспечная і прыгодная для ўжывання вада з індывідуальных калодзежаў, якімі зараз карыстаюцца пераважна ў сельскай мясцовасці, іх уладальнікі могуць даведацца, здаўшы ваду на даследаванне. Выконваюць гэту працэдуру ў тэрытарыяльным цэнтры гігіены.

Алена КРАВЕЦ.

ПІЦЬ ЦІ НЕ?

Пазалетась мы пісалі пра праблему жыхароў аграгарадка Васход у Магілёўскім раёне, якія скардзіліся на якасць пітной вады. «У ёй так шмат жалеза, што нават дарагія фільтры выходзяць са строю», — пісаў у сваім лісце ў рэдакцыю абураны чытач. Пасля таго як была пабудавана станцыя абезжалезвання, скаргі скончыліся. Чаго не скажаш пра іншыя населеныя пункты, дзе з якасцю вады хапае праблем. Па звестках аб'яднання ЖКГ Магілёўскай вобласці, іх на Магілёўшчыне больш за 700. Асноўныя нараканні — высокае ўтрыманне жалеза і неадпаведнасць па арганалептычных параметрах. Па самых сціплых падліках, на будаўніцтва адной невялічкай станцыі патрэбна 150—200 тысяч рублёў. Дзе ўзяць сродкі?

Спадзяванні толькі на крэдыты

— Аблвыканкам рэгулярна шле запыты ў Міністэрства ЖКГ, але гэта пытанне застаецца адкрытым, — кажа **начальнік аддзела аб'яднання Андрэй НЕСЦЕРАЎ.** — Напрыклад, падпраграмай «Чыстая вада» дзяржаўнай праграмы «Камфортнае жыллё і спрыяльнае асяроддзе» на 2016—2020 гады прадугледжвалася налета выдзяленне 4 мільёнаў 745 тысяч рублёў з рэспубліканскага і столькі ж з мясцовых бюджэтаў. Але ў кантрольных паказчыках Міністэрства фінансаў на наступны год гэтыя сумы ўжо не праглядаюцца.

❍ ТОЛЬКІ ЛІЧБЫ

На балансе сістэмы ЖКГ вобласці на 1 студзеня знаходзілася 1864 артэзіянскія свідравіны, 91 станцыя абезжалезвання, 214 ачышчальных збудаванняў каналізацыі, 350 каналізацыйных помпавых станцый, 6414,2 кіламетра водаправодных і 2344,4 кіламетра каналізацыйных сетак, каля 11 тысяч крыніц нецэнтралізаванага водазабеспячэння.

На сёння востра стаіць пытанне па чыстай вадзе ў Магілёўскім, Бабруйскім, Горацкім, Клімавіцкім, Крычаўскім, Хоцімскім, Асіповіцкім раёнах і ў Быхаве.

Шмат спадзяванняў ускладаецца на чарговы заём Сусветнага банка ў межах праекта развіцця сістэм водазабеспячэння і водаадвядзення. Але адно з яго патрабаванняў — наяўнасць праектна-каштарыснай дакументацыі. І не заўсёды знаходзяцца грошы, каб зрабіць яе аператыўна. І тады тэрміны ўводу запатрабаваных аб'ектаў адкладаюцца на невядомую перспектыву. Напрыклад, аблводаканалу, які яшчэ пазалетась пачаў працаваць над праектам сетак і збудаванняў, уключаючы станцыю абезжалезвання, водазабора Паўночны, толькі на праектна-каштарысную дакументацыю спатрэбілася 200 тысяч рублёў. Спецыялісты кажуць, што працэс праектавання вельмі замаруджвае шэраг умоўнасцяў у выглядзе конкурсаў, працэдур закупак, упарадкаванне зямельных адносін і гэтак далей.

❍ ЦІКАВА

Па некаторых звестках, павышанае ўтрыманне жалеза ў вадзе — адна з асноўных прычын біяабрастання водаправодных труб. Паводле даследаванняў, прычынай слізі, якая ўтвараецца на злучальных і стыкавых элементах трубапровода, з'яўляюцца жалезабактэрыі. З цягам часу біяабрастанні здольныя прывесці да пашкоджання і карозіі водаправоднай арматуры.

У Магілёўскім раёне за бюджэтныя сродкі сеткі і збудаванні водазабеспячэння былі пабудаваны ў вёсках Бабровічы, Сумарокава і Сенькава, зараз будаўніцтва працягваецца ўжо за крэдыты Сусветнага банка. Дадаткова за кошт сродкаў кансалідаванага бюджэту аблвыканкам вырашае пытанне забеспячэння чыстай вадой населеных пунктаў Дашкаўка, Сухары, Нікіцінічы-аэрапорт, Кадзіна, Масток, Вендараж, дамоў у раёне Салтанаўскага дома-інтэрната. Ёсць спадзяванні, што сёлета работы будуць выкананы.

Трубапровад замест станцыі

Будаваць станцыю абезжалезвання ў кожнай вёсцы зусім не абавязкова, кажуць камунальнікі і прыводзяць прыклады, як гэта вырашаецца за кошт далучэння сістэм камунальнага водазабеспячэння аднаго населенага пункта да сістэм другога, дзе нараканняў на якасць вады няма. Яскравы прыклад — вёска Купёлы Магілёўскага раёна, дзе гарводаканал пабудаваў за свае сродкі 200 метраў водаправода і даў магчымасць жыхарам піць чыстую воду.

— Нам гэта каштавала 33 тысячы рублёў уласных сродкаў, — удакладніў **галоўны інжынер Аляксандр ПАЛАГІН.**

Жыхары вёсак Прысна, Жукаўка, Сафіеўка, Новае Пашкава і некаторых іншых населеных пунктаў Магілёўскага раёна на працягу некалькіх гадоў шлюць гнеўныя лісты ў розныя інстанцыі, скардзяцца, што ў іх не вада, а атрута. Упраўленне капітальнага будаўніцтва Магілёўскага раёна зараз плануе за кошт мэтавых сродкаў паправіць становішча ў гэтых населеных пунктах па тым жа прынцыпе, як і ў Купёлах, — далучыць да Магілёва з яго трубаправодамі.

Але працэс забеспячэння насельніцтва чыстай вадой вельмі марудны: пакуль шукаюць грошы, каб пабудаваць адну станцыю, другая ўжо мае патрэбу ў мадэрнізацыі. Зношваюцца і астатнія складальнікі працэсу водазабеспячэння — свідравіны, трубы і іншае абсталяванне, ад работы якога таксама залежыць якасць вады. Бо і на гэта таксама патрэбны сродкі.

На 1 жніўня сярэдні знос сетак водазабеспячэння складаў ад 36 % у Магілёве да 86 % — у Хоцімскім раёне. Знос па сетках водаадвядзення (каналізацыі) прыкладна такі ж — ад 32,8 % у Бялыніцкім раёне да 88 % — у Хоцімскім.

Праект сваімі сіламі

Шэраг аб'ектаў водна-каналізацыйнай гаспадаркі з-за іх неналежнага тэхнічнага стану і адсутнасці дастатковых сродкаў на рамонт і мадэрнізацыю ў вобласці наогул не функцыянуюць. Як, напрыклад, станцыя абезжалезвання ў аграгарадку Ціманава Клімавіцкага раёна. Раённае прадпрыемства «Камунальнік» робіць усё магчымае, каб стабілізаваць абстаноўку.

❍ ТРЭБА ВЕДАЦЬ

Павышаная канцэнтрацыя жалеза ў вадзе адчуваецца па сцягнутасці і сухасці скуры пасля купання. Існуюць меркаванні, што гэты хімічны элемент з'яўляецца таксама адной з прычын развіцця дэрматытаў, алергічных рэакцый, захворванняў печані і нырак. Ёсць звесткі, што перавышэнне ГДК жалеза ў вадзе спрыяе павелічэнню рызыкі інфарктаў і пашкоджанняў тканак пры інсультах.

— Мы правялі перадпраектныя работы і зараз робім праект на будаўніцтва новай станцыі абезжалезвання, — кажа **галоўны інжынер прадпрыемства Дзмітрый СУДЗІЛОЎСКІ.** — Яны нам абышліся ў больш чым 17 тысяч рублёў. Плюс яшчэ 140 тысяч спатрэбіцца на будаўніцтва новай станцыі. Тая станцыя, якая была пабудавана ў канцы 80-х — пачатку 90-х, не спраўлялася з ачысткай вады ад жалеза. Яна ўзводзілася разам з пасёлкам, які прызначаўся для перасяленцаў з населеных пунктаў, пацярпелых ад аварыі на ЧАЭС. Пяць гадоў таму работа станцыі была прыпынена ў сувязі з поўным яе зносам. Мы неаднаразова падавалі заяўку на ўдзел у праграме «Чыстая вада», але сродкі так і не паступілі. Аграгарадок перспектыўны, колькасць жыхароў складае 1700 чалавек.

Але вада псуе ўсю карціну. Утрыманне жалеза ў ёй каля 2 міліграмаў на кубічны дэцыметр пры норме 0,3.

Дзмітрый Судзілоўскі кажа, што такое крытычнае становішча не толькі па Ціманаве. З 55 асноўных і рэзервовых артэзіянскіх свідравін, якія ёсць у раёне, толькі чатыры даюць якасную ваду. Раёну на сённяшні дзень неабходны 16 (!) станцый абезжалезвання. І грошай на гэта няма. Усе спадзяванні на крэдыты, у тым ліку Сусветнага банка. Галоўны інжынер кажа, што як толькі праект па Ціманаўскай станцыі будзе зроблены цалкам, яны пачнуць распрацоўваць наступны.

Вада на кантролі

Як лічаць у КДК Магілёўскай вобласці, які аналізаваў становішча спраў у гэтай сферы, на сённяшні дзень 199 населеных пунктаў вобласці маюць вострую патрэбу ў будаўніцтве ўстановак па абезжалезванні.

— У 25 з іх утрыманне жалеза ў вадзе складае звыш трох міліграмаў на кубічны дэцыметр. У Магілёўскім раёне такіх 14 населеных пунктаў, у Асіповіцкім — 3, у Клічаўскім, Краснапольскім, Бабруйскім — па 2, у Дрыбінскім і Крычаўскім — па 1, — удакладняе **Дзмітрый ЗАХАРАЎ, начальнік упраўлення кантролю за работай галін гаспадаркі Камітэта дзяржкантролю Магілёўскай вобласці.**

На 1 студзеня, па звестках КДК Магілёўскай вобласці, з 1864 артэзіянскіх свідравін у цэнтралізаваным водазабеспячэнні ЖКГ былі задзейнічаны 1472, з іх 1170 адпрацавалі нарматыўны тэрмін службы, у тым ліку двойчы — 681! Акрамя таго, 112 артэзіянскіх свідравін патрабуюць капітальнага рамонту. Па прыкладных ацэнках на гэта неабходна больш за 6 мільёнаў рублёў.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

ИЗВЕЩЕНИЕ

о проведении открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов в д. Завидичи и д. Дворище Лепельского сельсовета Лепельского района Витебской области

Организатор: Лепельский сельский исполнительный комитет

Лот	Месторасположение земельного участка, его площадь и кадастровый номер	Целевое назначение земельного участка	Условия и ограничения	Расходы по подготовке и изготовлению документации	Начальная цена, руб.	Сумма задатка, руб. (10 %)
1	**Деревня Завидичи, У16 Лепельский сельсовет, Лепельский район, Витебская область, Республика Беларусь, площадь 0,2487, кадастровый номер 222782504701000077**	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (код 1 09 02, земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него, сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме), без изменения целевого назначения	Водоохранная зона водного объекта (озеро Лепельское) (0,2487 га); Охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 вольт (0,0024 га)	1958,78	4000,00	400,00
2	**Деревня Завидичи, Лепельский сельсовет, Лепельский район, Витебская область, Республика Беларусь, площадь 0,2400 га, кадастровый номер 222782006601000049**	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (код 1 09 02, земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него, сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме), без изменения целевого назначения	Водоохранная зона водного объекта вне прибрежных полос (озеро Лепельское) (0,2400 га)	340,17	3500,00	350,00
3	**Деревня Дворище, Лепельский сельсовет, Лепельский район, Витебская область, Республика Беларусь, площадь 0,1479 га, кадастровый номер 222782004101000052**	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (код 1 09 02, земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него, сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме), без изменения целевого назначения	Водоохранная зона водного объекта (озеро Долгое) (0,1479 га)	360,17	3800,00	380,00

1. **Аукцион состоится 2 октября 2018 года в 14.30 по адресу: Витебская область, г. Лепель, ул. Партизанская, д. 10.**

2. Аукцион проводится в соответствии с Положением, утвержденным постановлением Совета Министров Республики от 26.03.2008 года № 462.

3. Заявления от граждан Республики Беларусь на участие в торгах принимаются по рабочим дням с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: Витебская обл., г. Лепель, ул. Партизанская, д. 10. **Последний день приема заявлений 28 сентября 2018 года**.

4. Для участия в аукционе необходимо предоставить копию документа, содержащего идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенную доверенность, а также предъявляется паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, и копии платежных документов, подтверждающих уплату задатка. К участию допускаются граждане РБ, подавшие заявление установленной формы, внесшие задаток в размере 10 % от начальной цены.

Сумма задатка перечисляется до подачи заявления на расчетный счет BY58AKBB36003190700710000000, код банка AKBBBY2X, г. Минск, ОАО «АСБ Беларусбанк», УНП 300039191

Получатель Лепельский сельский исполнительный комитет.

5. Не допускается начало торгов и продажа земельного участка по начальной цене.

6. Аукцион по лоту состоится при наличии не менее двух участников.

7. В течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона победитель аукциона обязан внести плату за земельный участок, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, расходы на публикацию в средствах массовой информации.

8. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с земельно-кадастровой документацией и земельным участком на местности.

9. Имеется возможность подключения всех земельных участков к инженерным коммуникациям (электроснабжение) и имеются подъездные дороги.

Контактные телефоны: 8 (02132) – 6-06-36; 8 (033) – 6144440.

Пасля жніва работа не спыніцца

Сёлета ААТ «Мацеевічы» святкуе 70-годдзе. І гаспадарцы, безумоўна, ёсць чым ганарыцца. Таварыства займае трэцяе месца ў раёне па ўраджайнасці збожжавых і зернебабовых культур. Пра сёлетнія дасягненні і планы на будучыню карэспандэнту газеты Жабінкаўскага раёна «Сельская праўда» расказаў дырэктар ААТ «Мацеевічы» Мікалай КАВАЛЬЧЫК.

— У верасні, пры запуску цукровага завода, пачнём уборку буракоў, — кажа кіраўнік. — Імі ў нас засеяна 300 гектараў. Плануем сабраць каля 15 тысяч тон. У нас ёсць уласны буракаўборачны камбайн, якому давядзецца папрацаваць адразу ў дзвюх гаспадарках: сёлета мы заключым дагавор аб аказанні дапамогі ААТ «Жабінкаўскі». Работа будзе напружаная. У галіне жывёлагадоўлі мы таксама не адстаём па паказчыках. Сёння ў ААТ «Мацеевічы» налічваецца 3410 галоў буйной рагатай жывёлы, пагалоўе дойнага статка складае тысячу галоў. Для іх утрымання ў гаспадарцы дзейнічаюць восем жывёлагадоўчых фермаў.

Час прыбрацца

Лельчыцкі раённы Савет дэпутатаў выступіў з ініцыятывай аб арганізацыі штотыднёвых суботнікаў на тэрыторыі сельскіх Саветаў. Першы па чарзе быў Бараўскі сельсавет, піша карэспандэнт «Светлага жыцця».

www.lelchitsy.by

З самага ранку мабільны тэлефон старшыні сельвыканкама Людмілы Ашомкі, здавалася, не змаўкаў ні на хвіліну. Яна давала распараджэнні згодна з распрацаваным планам і паралельна дамаўлялася з дастаўкай то мотакасы, то бензапілы, то вяроўкі для выдалення дрэў, якія ўсохлі.

У маланаселеным пункце Тартак фронт работ значны: неабходна было высекчы дробную хмызняковую расліннасць уздоўж цэнтральнай дарогі і былога будынка школы, прыбраць могілкі, несанкцыянаваную звалку, прылеглую тэрыторыю да таварнай фермы і гэтак далей.

У суботніку прыняў актыўны ўдзел і старшыня раённага Савета дэпутатаў Сяргей Касінскі.

Вяртанне з прытулку

Паўгода Назар, Васіліса і Сафія чакалі ў сацыяльным прытулку сваю маці. Яна змагла пераадолець свае шкодныя звычкі і забраць дзяцей дадому, піша карэспандэнт «Раённага веснік» Чэрвеньскага раёна.

Сёлета 8 лютага раённая камісія па справах непаўналетніх прыняла рашэнне аб адабранні трох непаўналетніх дзяцей у жыхаркі вёскі Горкаўская Слабада. Як растлумачыла намеснік старшыні камісіі па справах непаўналетніх Наталля Сцяжко, жанчына злоўжывала алкаголем, не займалася выхаваннем дзяцей і стварыла для іх нязносныя ўмовы жыцця. Маці накіравалі на лячэнне. Яна яго прайшла, і зараз мае намер дастойна выхоўваць сваіх дзяцей, працуе, не ўжывае спіртнога. Час на выпраўленне становішча прайшоў. На пачатку жніўня камісія прыняла рашэнне вярнуць дзяцей маці. Але некаторы час сям'я будзе ў полі зроку камісіі.

Надзея АНІСОВІЧ.

БЕЗ ЖАЛЕЗА, АЛЕ НЕ ПАЎСЮЛЬ

Забяспечанасць насельніцтва вадой пітной якасці на Гомельшчыне паступова набліжаецца да 90 %

Сёлета 65 тысяч жыхароў Рэчыцы на свае вочы ўпэўніліся, што нарэшце з кранаў цячэ чыстая вада. Пабудаваная станцыя абезжалезвання вырашыла праблемы, якія існавалі дагэтуль. Паводле санітарных правілаў і нормаў, у пітной вадзе лімітавана дапушчальная канцэнтрацыя жалеза — да 0,3 міліграма на літр. Цяпер у рэчычан — толькі 0,1 мг. Між іншым, раней было 0,6–0,7 мг.

Будаўніцтва станцыі на водазаборы «Галаўной» планавалася даўно. Магчымасць з'явілася, калі Міжнародны банк рэканструкцыі і развіцця выдаткаваў на рэалізацыю праекта пазыку ў памеры 2 мільёнаў 175 тысяч долараў.

Станцыю новага пакалення пабудавалі за 8,5 месяца «пад ключ»: ад заказу, вытворчасці абсталявання, пуска-наладачных работ да сэрвіснага абслугоўвання. Яна цалкам аўтаматызаваная. Да таго ж — энергаэфектыўная. Вада паступае на ачыстку без дадатковага помпавага абсталявання, самацёкам. У Рэчыцы скарыстана адна з апошніх распрацовак — безнапорная блокава-модульная станцыя «Крышталь-Б». Пры гэтым выкарыстоўваецца палімернае рэчыва айчыннай вытворчасці. У станцыях папярэднага пакалення выкарыстоўваўся друз, кварцавы пясок і вугаль, а ў новай — палімерная крошка. Менавіта на яе асядае жалеза. Брудная вада скідваецца, а чыстая ідзе спажыўцу. Акрамя таго, у Рэчыцкім раёне сёлета пабудаваны вадавод ад станцыі абезжалезвання ў Холмечы да вёскі Дварэц, а два гады таму жыхары вёскі Зашчоб'е таксама сталі спажываць чыстую ваду.

За кошт сродкаў мясцовага бюджэту ў гэтым годзе мадэрнізавалі сістэму водазабеспячэння ў трох населеных пунктах Мазырскага раёна, у адным — Жыткавіцкага. Выканана закальцоўка водаправоднай сістэмы ў вёсцы Беліца Жлобінскага раёна з водаправоднай сістэмай райцэнтра, пабудавана станцыя абезжалезвання ў вёсцы Папаратнае, расказаў **намеснік генеральнага дырэктара дзяржаўнага аб'яднання «Жыллёва-камунальная гаспадарка Гомельскай вобласці» Вячаслаў ПАРХОМЕНКА:**

— Вадой, якая адпавядае ўсім санітарным нормам і правілам, з 2016 года карыстаюцца і жыхары вёскі Акцябр у Жлобінскім раёне. Мясцовае камунальнае прадпрыемства далучыла населены пункт да гарадскіх водаправодных сетак за кошт уласных сродкаў прадпрыемства. Акрамя таго, у КВУП «Гомельводаканал» рэалізавалі праект «Водазабеспячэнне мікрараёна Касцюкоўка ў Гомелі». Паўночны раён абласнога цэнтра далучаны да гарадской сістэмы водазабеспячэння. Зроблена гэта было за кошт сродкаў мясцовага бюджэту і ўласных сродкаў прадпрыемства.

Гэта работа — частка дзяржаўнай палітыкі, якая на сённяшні момант замацавана спецыяльнай праграмай «Камфортнае жыллё і спрыяльнае асяроддзе» і яе падпраграмай «Чыстая вада» на 2016—2020 гады». Для дасягнення мэтавых паказчыкаў забеспячэння насельніцтва вадой пітной якасці праводзяцца такія мерапрыемствы, як, напрыклад, далучэнне сістэмы водазабеспячэння населеных пунктаў з якасцю вады, якая не адпавядае гігіенічным патрабаванням, да побач размешчаных населеных пунктаў.

Спецыялісты разлічваюць, што праграма «Чыстая вада» будзе працягнута да 2025 года. Тады і атрымаецца цалкам зняць з парадку дня пытанне забеспячэння вадой пітной якасці ўсяго насельніцтва Гомельшчыны.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

БОБОВИЧСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ ГОМЕЛЬСКОГО РАЙОНА

3 октября 2018 года в 15.30 проводит открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

№ лота	Адрес земельного участка	Кадастровый номер	Площадь земельного участка	Инженерная инфраструктура	Расходы по подготовке (руб.)	Начальная цена земельного участка (руб.)	Задаток (руб.)
1	Гомельский район, Бобовичский с/с, аг. Бобовичи, ул. Садовая, участок № 2 В	321080800601000890	0,1242 га	Имеется возможность электроснабжения, централизованного водоснабжения, дорога в гравийном состоянии	1147,21 и расходы за опубликование в СМИ	6396,3	639,6
2	Гомельский район, Бобовичский с/с, аг. Бобовичи, ул. Садовая, участок № 241	321080800601000941	0,1260 га	Имеется возможность электроснабжения, централизованного водоснабжения, дорога в гравийном состоянии	1184,24 и расходы за опубликование в СМИ	6489	649
3	Гомельский район, Бобовичский с/с, аг. Бобовичи, ул. Луговая, участок № 50	321080800601000974	0,1293 га	Имеется возможность электроснабжения, дорога в гравийном состоянии	1407,16 и расходы за опубликование в СМИ	7809,72	781
4	Гомельский район, Бобовичский с/с, д. Уза, ул. Лесная, участок № 69	321080801201000260	0,1388 га	Имеется возможность электроснабжения, централизованного газоснабжения	1313,26 и расходы за опубликование в СМИ	7564,6	756,5

Аукцион состоится по адресу: г. Гомель, ул. Ильича, д. 51А, зал заседаний Гомельского райисполкома **03.10.2018 в 15.30.**

К участию в аукционе допускаются физические лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток в размере, порядке и сроке, определенные в извещении.

Граждане, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

Документы, необходимые для участия в аукционе:

Заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков.

Документ, подтверждающий внесение суммы задатков (на расчетный счет с отметкой банка).

Гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);

представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

Аукцион признается несостоявшимся в случаях, если ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем; заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками аукциона (в этом случае земельный участок предоставляется в частную собственность единственному участнику несостоявшегося аукциона, при его согласии, с внесением платы за земельный участок в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 %).

Внесение платы за предмет аукциона и возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, осуществляются в установленном порядке победителем аукциона или единственным участником аукциона в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.

Задаток за участие в аукционе перечисляется на расчетный счет № BY74AKBB36414140200453100000 Бобовичского сельского исполнительного комитета, филиал № 302 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Гомель, ул. Барыкина, 94, код банка AKBBB421302, УНП 400178403.

Заявления на участие в аукционе с необходимыми документами принимаются по адресу: Гомельский район, агрогородок Бобовичи, ул. Пролетарская, 1А, Бобовичский сельский исполнительный комитет с даты опубликования извещения до 1 октября 2018 года.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками в Бобовичском сельском исполнительном комитете.

Контактные телефоны: +375291390201, 910244

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А. А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л. А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В. М.,** намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А. Э.,** намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В. В.,** старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т. Л.,** старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М. Л.,** старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 292 44 12;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 20.008. Нумар падпісаны ў 19.30 30 жніўня 2018 года.